Госці з Амерыкі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Вандроўкі „Нівы” ☞ I-IV

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2781) Год LIV | Беласток, 30 жніўня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Міхась СЦЕПАНЮК

Грабарка — малітва і сіла

— У Грабарцы ёсць нейкая вышэйшая сіла, якая сюды прыцягвае, — гаворыць паломніца з Бельска-Падляшскага. — Духоўная атмасфера пануе не толькі падчас самога Спаса, але і падчас пілігрымкі, — дадае.

— Грабарка гэта крыніца духоўнасці і хаця тут многа людзей, гэтае месца дае нагоду спазнаць духоўны спакой, — тлумачыць маладая дзяўчына, — і можа таму так шмат людзей прыязджае сюды з усяго Падляшша і усёй Польшчы.

У гэтым годзе, як заўсёды, гара Грабарка на свята Праабражэння Гасподняга прыцягнула некалькі тысяч праваслаўных вернікаў з усяе Польшчы і замежжа. На „гару крыжоў” прыехалі і прыйшлі яны з сапраўды рознымі намерамі: хто падзякаваць Усявышняму, хто прасіць дапамогі ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Хаця штуршкі і прычыны розныя, мэта адна — Грабарка, найважнейшы праваслаўны санктуарый у Польшчы.

Фота Міхала КОРХА

Адмысловы характар мела польска-беларуская пілігрымка, якая 15 жніўня выйшла на святую гару Грабарку з Белавежы. Яе маршрут пралягаў праз тэрыторыю Польшчы і Беларусі.

— У гэтым годзе, на жаль, не давялося мне прыняць удзелу ў паломніцтве і вельмі шкадую, бо гэта непаўторны духоўны досвед, — гаворыць мне маладая дзяўчына з Бельска.

Фактычна, многія вернікі не ўяўляюць сабе іншага спосабу прыбыцця на святую гару, чым пілігрымаванне супольна з іншымі паломнікамі. Некалькі дзён падарожжа, супольнай малітвы, посту, роздумаў даюць сілу, каб, дайшоўшы ўжо на святое месца, тройчы абысці царкву Праабражэння Гасподняга на каленях і паставіць побач яе крыж, які з сабою прынеслі. І якраз з-за тысяч крыжоў, прыношаных штогод паломнікамі, Грабарку называюць „гарой крыжоў”. Некаторыя крыніцы падаюць, што на Грабарцы зараз знаходзіцца каля 10 тысяч крыжоў.

Гісторыя Грабаркі сягае ажно пачаткаў XVIII стагоддзя, калі падчас эпідэміі халеры жыхару Сямятыч было аб'яўлена, што людзі змогуць ацалець толькі на Грабарцы. Жыхары навакольных мясцовасцей, сабраныя на гары Грабарцы, паставілі тут крыж і ў цудоўны спосаб аздаравелі. З гэтага часу на святой гары пачалі збірацца тысячы вернікаў. Сённяшнія паломнікі ў пэўнай ступені працягваюць традыцыю трохсотгадовай даўнасці, бо ўжо тады Грабарка стала мэтай многіх пілігрымак.

У гэтым годзе, як і ў папярэдніх, на Грабарку падаліся многія паломніцтвы з Падляшша і не толькі. Пілігрымкі выйшлі між іншым з Беластока, Саколкі, Бельска-Падляшскага, Сямятыч, Яблачына, Гайнаўкі. Цікава, што ад некалькіх гадоў паломніцтва на святую гару выходзіць з Варшавы. Яе ўдзельнікі вандруюць праз абшары, на якіх зусім не пражываюць праваслаўныя, і толькі пасля перасячэння ракі Буг трапляюць у першую мясцовасць, заселеную праваслаўнымі вернікамі.

— З кожным годам штораз больш маладых людзей ходзіць у паломніцтва і гэта вельмі добра, — гаворыць старэйшая ўдзельніца паломніцтва з Бельска.

Адмысловы характар мела таксама польска-беларуская пілігрымка, якая 15 жніўня выйшла на святую гару Грабарку з Белавежы. Яе маршрут пралягаў праз тэрыторыю Польшчы і Беларусі. Удзельнікі гэтага незвычайнага паломніцтва з Белавежы падаліся ў Беларусь, дзе далучыліся да іх паломнікі з Беларусі. Усе разам падаліся ў паломніцтва і пасля вандроўкі праз Беларусь у Пяшчатцы-Полаўцах перайшлі на польскі бок мяжы.

Мэтай гэтага паломніцтва было прыпомніць, што некалі, пакуль на нашых землях усталявалі мяжу, жыхары тэрыторый, якія сёння знаходзяцца ў дзвюх дзяржавах, супольна выпраўляліся на Грабарку.

— Прыйшлі мы на святую гару, паставілі крыж, памаліліся Богу, каб у будучым дазволіў яшчэ большай колькасці людзей пайсці ў нашым паломніцтве, — тлумачыць мне ўжо падчас свята Праабражэння Гасподняга адзін з удзельнікаў гэтай незвычайнай пілігрымкі. — Грабарка гэта месца вельмі намоленае. На яе атмасферу ўплывае таксама прырода. Грабарка кожнага чалавека звяртае да Бога, каб мы задумаліся што зрабілі не так, каб свае думкі і малітвы звярнулі ўгару, — дадае.

Многія з тых, хто прыходзіць ці прыязджае на Грабарку, шукае аздараўлення і дапамогі ў цудатворнай крыніцы, якая выцякае побач гары. Праваслаўныя, і не толькі, хрысціяне абмываюць хворыя месцы з надзеяй, што божае блаславленне, якім ад вякоў лунае святая гара Грабарка, сплыве таксама на іх.

Калі нехта падаецца на Грабарку напярэдадні Праабражэння Гасподняга або ў само свята, пакуль дойдзе на гару, мусіць прабіцца праз ларкі з рознымі таварамі, якія не маюць многа супольнага з праваслаўем (ручныя вырабы, цацкі, CD з дыска-пола). На шчасце не стаяць яны побач самой гары, але ў пэўнай ад яе адлегласці.

Спасаўскія святкаванні (18-19 жніўня) на Грабарцы выпалі ў гэтым годзе на сярэдзіну тыдня. Аднак не перашкодзіла гэта некалькім тысячам вернікаў прыбыць на святое месца.

Урачыстыя багаслужбы пачаліся у аўторак 18 жніўня. Узначальваў іх мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава. Ганаровым госцем святкаванняў быў архіепіскап Кіпра Хрызастом. Малітвы і багаслужэнні працягваліся на святой гары ўсю ноч. У сам дзень свята Праабражэння Гасподняга галоўную літургію ўзначаліў мітрапаліт Сава. Удзельнічалі ў ёй таксама архіепіскап Хрызастом, мітрапаліт Пафаса Юры, архіепіскап лодзінска-познаньскі Сіман, архіепіскап люблінска-холмскі Авель, архіепіскап гайнаўскі Міран ды епіскап горліцкі Паісій.

Жыццё ў крэдыт ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Вось і зараз Аляксандр Рыгоравіч нечакана стартануў у Сочы. Нечакана, хутка і рашуча. Як гаворыцца ў народзе — без аб'яўлення вайны. Праўда, перад ад'ездам паспеў пакрытыкаваць Захад і пахваліцца тым, што ў нас з Расіяй не проста дзелавыя адносіны, і нават не добрыя, а выдатныя...

Помнік на мяжы ☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэатр для людзей ☞ 8

Ілона КАРПЮК

Сакі ☞ 12

Аляксей МАРОЗ

Пажаданні

Усім настаўнікам і вучням поспехаў у новым навучальным годзе 2009/2010 жадае

Рэдакцыя

Малюнак Мірка ЗДРАЙКОЎСКАГА

БАЦЬКА, што Ты, зрабіў, каб Твае **ДЗІЦЯ** не забыла **МОВЫ** Тваіх бацькоў, ці вучыш іх шанаваць **ВЕРУ** і традыцыі сваіх **ДЗЯДОЎ**?

9 770546 196000

Жыццё ў крэдыт

Колькі ваўка не кармі, ён усё адно ў лес глядзіць. Так сцвярджае беларуская народная мудрасць і пацвярджае сённяшняя беларуская рэчаіснасць. І колькі Еўропа не дае беларускаму рэжыму крэдытаў і не паказвае мажлівых перспектыў, кіраўніка Беларусі больш прываблівае Расія.

Вось і зараз Аляксандр Рыгоравіч нечакана стартануў у Сочы. Нечакана, хутка і рашуча. Як гаворыцца ў народзе — без аб'яўлення вайны. Праўда, перад ад'ездам паспеў пакрытыкаваць Захад і пахваліцца тым, што ў нас з Расіяй не проста дзелавыя адносіны, і нават не добрыя, а выдатныя.

А яшчэ начальнік беларускай дзяржавы паабяцаў, што калі заходнія палітыкі будуць ставіць перад беларускім рэжымам нейкія ўмовы, то ў іх нічога не атрымаецца. Ён нібыта гатовы працаваць і з Еўропай, і з Амерыкай, але ўладу аддаваць апазіцыі не збіраецца. І ніхто не зможа гэтую ўладу ад яго адабраць і нікому не зможа перадаць. І заявіў, што мы ў зямлянкі пойдзем, але добрае жыццё забяспечым.

Нічога нечаканага ў такіх заявах няма. Рана або позна так павінна было адбыцца. І адбылося б у кожным выпадку. Можна, канешне, было павадзіць Еўропу за нос яшчэ нейкі час, але ж перад паездкай у Расію трэба было паказаць неяк сваю адданасць старэйшаму брату. Таму гэтыя словы былі сказаны цяпер, а не пазней.

І вось ужо два славянскія прэзідэнты будуць нешта вырашаць у Сочы і пасмейвацца з еўрапейскіх давальнікаў крэдытаў. Ды і сапраўды ёсць з чаго пасмяяцца. Бо заходнікі не могуць зразумець галоўнага: што сутыкнуліся не проста розныя эканомікі, не проста розныя палітычныя сістэмы, а зусім розныя, можна сказаць супрацьлеглыя, стылі мышлення. Бо калі еўрапейцы даюць крэдыты і ставяць умовы, каб не было палітвязняў, каб была свабода слова і незалежныя сродкі масавай інфармацыі, каб былі праведзены свабодныя выбары па еўрапейскіх стандартах і рэгістраваліся палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, яны не могуць зразумець, што з усяго гэтага дабра беларускаму рэжыму патрэбны толькі грошы. Бо калі выканаць усе гэтыя ўмовы, то і ўладу можна згубіць. А навошта тады браць крэдыты, калі яны дастануцца некаму так. Таму ад самога пачатку было ясна, што грошы беларускія ўлады возьмуць, а пастаўленых умоў выконваць і не збіраюцца.

А выконваць будуць тое, пра што дамовяцца ў Сочы. Там усё ясна і проста. І эканомікі падобныя, і палітычныя сістэмы аднолькавыя і стыль мышлення ідэнтычны. Два славянскія прэзідэнты, безумоўна з удзелам трэцяга, які кіраваў Расіяй да Мядзведзева, кіруе ёй пры Мядзведзеве, будзе кіраваць і пасля яго, дамовяцца і пра прызнанне Абхазіі і Паўночнай Асеціі, і пра адзіную эканамічную прастору, як у гулагу, і пра калектыўныя войскі, якімі ой як дарэчы можна будзе паганяць апазіцыю краін-удзельнікаў, як некалі падобныя агульныя войскі Варшаўскай дамовы падчас існавання сацыялістычнага лагера душылі паўстанні ў краінах Усходняй Еўропы. Так што заходнія грошы, якія даваліся пад умову развіцця на Беларусі дэмакратыі, хутчэй за ўсё будуць працаваць супраць яе.

Наўрад ці браты славяне будуць у Сочы размаўляць пра кошты газу і нафту ды пра беларускае малако на расійскім рынку. Такія дробныя пытанні яны могуць вырашыць і па тэлефоне, калі захочуць. Ды яны хіба што ўжо даўно вырашаныя. А можа і праблемы аніякой не было. Так, пасканадалілі крыху з суму, і каб Захад падурніць ды крэдыты выбіць.

А заходнія крэдыты акурат паспелі своечасова. Агульныя войскі ўжо ў верасні правядуць вучэнні на беларускай зямлі. А гэта не так ужо і танна. Трэба ж пакарміць салдацікаў. І сваіх, і чужых. А генералам даць мажлівасць уволю пагуляць у вайну, пастраляць з дарагой зброі. А кіраўнікам краін памарыць пра званне генералісімуса, пра яшчэ большыя заходнія крэдыты, на якія так добра жывецца, ці хаця б пра аднаўленне Расійскай Імперыі ў межах 1913 года, або Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, адным з першых рашэнняў якога быў загад не аддаваць заходнім краінам пазыкі, якая ў выглядзе крэдытаў атрымлівала былая ўлада.

Віктар САЗОНАЎ

Памылкі (2)

З другога боку помніка савецкім салдатам на гайнаўскім вайсковым могільніку надпіс на рускай мове, а з другога — на беларускай. Усё здавалася б, тут добра, культурна, дэмакратычна. Каб не адно „але"...

Вось арыгінальны рускі тэкст: „Памяти офицеров и солдат Красной Армии покоящихся на этом кладбище погибших в борьбе с немцами в Хайнувце и её окрестностях в июне 1941 годи и июле 1944 года. Общественность Хайнувки 2009".

А вось беларускі: „Памяці спачываючых на гэтых могілках афіцэраў і салдатаў Чырвонай Арміі загінуўшых падчас барацьбы з немцамі ў Хайнаўцы і яе аколіцах у чэрвені 1941 году і ў ліпені 1944 году. Грамадскасць Хайнуўкі 2009".

Цяпер давайце дакладненька прыглянемся тэкстам і пашукаем гэтага „але".

Па-мойму слова „покоящихся" — гэта яшчэ не зусім па-руску... „В июне 1941 годи" — зусім не па-руску. „Червень" па-беларуску пішацца не з „е" а з „э". Ну і ў абодвух тэкстах зусім скалечылі прыгожую назву нашай Гайнаўкі: „Хайнувце, Хайнувки, Хайнаўцы, Хайнуўкі". Мала ўжо бракавала назваць яе зусім вульгарным словам. Каму гэта патрэбна?! Як на адзін помнічак штосьці замнога гэтых „але". А гэта ж помнік-памяць — разлічаны на доўгія, доўгія гады. Нас ужо не будзе, а ён будзе свечдыць аб „покоящихся в Хайнувки".

Чаму ў рускім і беларускім тэксце Гайнаўка называецца Хайнуўкай, калі ў польскім тэксце і карэннае мясцовае насельніцтва называла і называе яе Гайнаўкай, Гайнуўкай, сам не ведаю. Хайнуўкай называюць яе толькі тыя, хто не ўмее вымаўляць заднеязычны гук „г", значыць, з цэнтральнай і заходняй Польшчы. Або тыя мясцовыя людзі, якія вельмі хутка хочуць спаланізавацца. У цэнтральнай і заходняй Польшчы не ўмеюць таксама вымавіць пярэднеязычнае „л". То што, і мы павінны вучыцца не вымаўляць яго? У артыстычных школах Польшчы, у якіх абавязкова вучаць чыстаму вымаўленню ўсіх гукаў алфавіта, мноства клопатаў маюць такія студэнты.

Нават у польскай прэсе часценька паяўляюцца просьбы палягчэння арфаграфічных правіл. Вось і ў 27 нумары штотыднёвіка „Angora" ад 5 ліпеня гэтага года ў артыкуле „Zbędna ortografia?" чытаем: „Czy nie warto skończyć wreszcie z anachronizmem w postaci używania w pisowni języka polskiego dwojakich znaków na określenie tych samych zgłosek? Chodzi mi w szczególności o: u (ó), h (ch) i ż (rz). Naukę rozróżniania sytuacji, kiedy należy używać jakiejś litery, zamęcza się kolejne pokolenia — mom zdaniem — zupełnie bezsensownie".

Пакуль, аднак, такая рэформа не адбылася, трэба пісаць паводле існуючых арфаграфічных правіл. А гэта значыць, Гайнаўка і надалей павінна пісацца праз „Г", а не „Х". І нават каб і адбылася такая рэформа, у што я, канешне, не веру, і ролю „г" пераняла б на сябе „х", у рускай і пераважна беларускай арфаграфіі такое напэўна не адбудзецца. Там гэты гук нясе на сабе вялікую нагрузку і без яго ніяк нельга абысціся.

Калі я працаваў над гэтай тэмай, прыпомніўся мне адзін савецкі анекдот (а можа і не анекдот) з часоў майго студэнцтва. У савецкія часы — як вядома — бывалі частыя нястачы розных тавараў і прадуктаў. У час аднаго такога крызісу група савецкіх грамадзян выступіла да ўлад з прапановай ліквідаваць у рускім алфавіце літару „м" з-за яе непатрэбнасці, бо малака няма, мукі няма, мяса няма... Начальства думала, думала і як бы пачало згаджацца, але раптам хтось крыкнуў: „Стой! А Мікаян?"

І сапраўды, быў тады Мікаян, Анастас Мікаян. Быў ён не абы-якой шышкай, а спецам па савецкай эканоміцы, гандлю і шмат чым іншым. Як было далей з малаком, мукой і мясам не ведаю, але літару „м" ён выратаваў ад знікнення. І гэта была б адна з яго найбольшых заслуг.

Я яшчэ раз заглянуў у „Савецкую энцыклапедыю" і там знайшоў і пра выдатныя эканамічныя, і гандлёвыя, і палітычныя заслугі Анастаса Мікаяна. А вось пра яго, так бы мовіць, лінгвістычныя заслугі — ні гу-гу, ні кукарэку.

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Палоханне палякамі

У мінскай, урадава-парламенцкай газеце „Звязда" нядаўна з'явіўся артыкул пад знамянальным загалоўкам: „Карта паляка: хто маўчыць, а хто крычыць?" Дазволю тут прывесці ладны фрагмент гэтага тэксту, паколькі некаторыя сцвярджэнні ў ім сапраўды кур'ёзныя.

Публіцыст наконт Карты паляка прымяняе акрэсленне „міні-квазіграмадзянства" і мае яна быццам бы абавязваць да вернасці польскай дзяржаве. Трывогу аўтара выклікае м.інш. сітуацыя на Украіне, дзе — на яго думку — у заходняй яе частцы неўзабаве мае ўзнікнуць анклаў з інтарэсамі накіраванымі на Польшчу, а рашуча меншым і на Украіну. І ўрэшце Сяргей Аляксандраў даходзіць да кашмарнай высновы: „На форумах у інтэрнэце і на старонках некаторых украінскіх СМІ абсалютна сур'ёзна і даволі актыўна абмяркоўваецца пытанне, ці не пераўтворацца ўладальнікі карты паляка ў своеасаблівую „пятую калону", агентуру ўплыву суседняй дзяржавы на развіццё падзей на Украіне? Выказваюцца думкі і геапалітычнага маштабу. Маўляў, ці не паспрабуе польскі бок пры магчымым змяненні сітуацыі ва Украіне скарыстацца картай для рэвізіі палітычнай карты Усходняй Еўропы? Калі разабрацца, не такая ўжо і лухта. У польскім грамадстве даволі шырока прадстаўлены сілы, якія спяць і бачаць „Вялікую Польшчу" ў межах калі не „ад можа да можа", дык хоць 1939 года. Натуральна, пра такі перагляд межаў ваенным шляхам у сучаснай Еўропе размовы весціся не можа, але, як паказвае прыклад таго ж Косава, можна беспакарана адарваць кавалак тэрыторыі суверэннай дзяржавы псеўдалегітымным шляхам — напрыклад, правесці рэферэндум".

Пры нагодзе размовы з генконсулам Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхалам Аляксейчыкам я спытаўся, што ён думае аб данясеннях „Звязды". Пачуў:

— Можна было прадбачыць, што Карта паляка стане свайго роду бомбай. Таксама небяспечнай, як, напрыклад, пабудова пад Варшавай ядзернай электрастанцыі.

Адзін са стваральнікаў Карты, дарадчык прэзідэнта Леха Качынскага Міхал Дворчык зараз пасля публікацыі ў мінскай газеце тлумачыў у сваю чаргу адной з польскіх штодзёнак:

— Стваральнікі Карты не мелі ніякіх варожых намераў супраць краін, у якіх яна функцыянуе. Справа ў тым, каб дапамагчы асобам, якія адчуваюць сябе палякамі, у кантактах з Польшчай. Хутчэй тыя, што абвінавачваюць Карту, маюць благія інтэнцыі і кіруюцца на выкліканне канфліктаў. Мне здаецца, што „Звязда" і Сяргею Аляксандраву фактычна залежала на выкліканні канфлікту, асабліва што спасылаецца ён на такія „аўтарытэтныя" крыніцы як таямнічыя інтэрнэтныя форумы, „некаторыя ўкраінскія СМІ", аднаго з дэпутатаў ад хрысціянскіх дэмакратаў у літоўскім Сейме, вядомага сваімі непрыхільнымі Польшчы поглядамі, ці „польскія сілы". Паспяхова напалохаў ён пагрозай, якой з'яўляецца быццам бы далучэнне заходніх рэгіёнаў Беларусі і Украіны да Польшчы. Нядобра сталася, што гэтая публікацыя паявілася перад 70-й гадавінай выбуху ІІ сусветнай вайны і перад запланаваным на 1 верасня з'ездам Саюза палякаў Беларусі Юзафа Лучніка, прызнаванага Лукашэнкам (улады не прызнаюць СПБ Анжалікі Борыс).

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

З далёкіх бакоў — у беларушчыну

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У нашай рэдакцыі. З „Нівай" у руках Курт Вулгайзер

Не першы раз сустракаем на Беласточчыне амерыканскага славіста Курта Вулгайзера. Убачыўшы, а асабліва пачуўшы яго, адразу хочацца спытацца: а адкуль вы прыехалі з Беларусі? Адкуль зацікаўленне беларушчынай у гэтага гарвардца, а таксама і ў тых, каго ён уцягнуў у гэтую нялёгкую і мала выгадную справу? Бо прывёз ён з сабою на летнюю школу — спачатку на Беласточчыну, а пасля ў Беларусь — жменьку падобных сабе незвычайных амерыканцаў.

— Я, будучы яшчэ аспірантам, яшчэ ў 1988 годзе зацікавіўся беларускай мовай, гісторыяй беларускай мовы. Я тады займаўся гісторыяй кнігадрукавання ў славян, даведаўся пра выданні Францішка Скарыны. Можна сказаць, што мая цікавасць была больш у баку гістарычнай лінгвістыкі, а потым я зацікавіўся дыялекталогіяй і сацыялінгвістыкай. Адкуль я сам паходжу, цяжка сказаць, таму што мае карані з самых розных краін Еўропы; таму я сябе лічу еўра-амерыканцам. Ёсць у мяне продкі з Эльзаса, гэта таксама пагранічча, а акрамя гэтага з Англіі, з Ірландыі, з Нарвегіі, з Даніі. І нядаўна я даведаўся, што ўсё ж такі ёсць сувязь нават з Польшчай, бо продкі маёй мамы, як высветлілася, паходзілі з вёскі Гурков, па-польску гэта Гуркі-Нотэцке, на Любушскай зямлі. Былі яны нямецкамоўныя, але цікава, што яшчэ ў семнаццатым стагоддзі ў гэтай вёсцы пастары скардзіліся на тое, што не могуць свае казанні даваць на нямецкай мове, паколькі там ніхто не разумее па-нямецку... Я нарадзіўся ў Штатах, у штаце Вісконсін, а жыву зараз у штаце Масачусэтс, выкладаю ў Гарвардскім універсітэце.

На Беласточчыну прыехалі студэнты Курта Вулгайзера.

— Мне прапанавалі стварыць гэтую школу толькі ў лістападзе мінулага года. Сярод студэнтаў ёсць нават такія, што нядаўна абаранілі дысертацыі, яны ўжо кандыдаты навук. У нас ёсць толькі адна жанчына, у якой ёсць нейкія беларускія карані — продкі яе маці былі з Ашмяншчыны. Ёсць розныя крыніцы зацікаўлення ў іх беларушчынай. Вось гэтая жанчына, у якой продкі з Беларусі, — яна хацела вывучаць і мову, і культуру Беларусі; заўтра вось едзем у Беларусь і будзем мець магчымасць наведаць гэтыя мясціны. Заснаванне інстытута прапанаваў мне дырэктар Цэнтра беларускіх даследаванняў у каледжы Саўт-Вэстэрн у Канзасе. Гэты цэнтр заснавалі зусім нядаўна як асяродак для вывучэння беларускай мовы, культуры, гісторыі. Гэты асяродак быў заснаваны дзякуючы былому першаму паслу ЗША ў Беларусі Дэвіду Суорцу, які таксама ў свой час заснаваў Еўрапейскі гуманітары ўніверсітэт у Мінску. Калі ЕГУ зачынілі (ён пераехаў у Вільню), з некаторымі калегамі яны вырашылі, што частку гэтых грошай трэба направіць на стварэнне такога асяродка ў Злучаных Штатах. Чаму Канзас, і маленькі каледж у Канзасе? Гэта альма-матэр пасла Суорца, у яго вельмі добрыя адносіны з кіраўніцтвам каледжа, і ён лічыў, што будзе прасцей стварыць такі цэнтр, які будзе каардынаваць розныя праекты, у тым ліку і летнюю школу. Яны зрозумелі, што мала каму захочацца паехаць у Канзас, каб вывучаць беларускую мову. Чаму б не тут, на Беласточчыне? У Беларусі складаней, бо там адразу будуць абмежаванні па тэматыцы, значыць, палітыкі нельга будзе чапаць... Дык вырашылі, што будзе лепш гэтую школу правесці тут. Паколькі наладзіліся ў нас добрыя кантакты з Алегам Латышонкам, дык рашылі разам з Беларускім гістарычным таварыствам стварыць летнюю школу на Беласточчыне. Студэнты прабывалі на Беласточчыне прыблізна месяц. Мы вельмі ўдзячны дырэктару Гайнаўскага белліцэя за тое, што ён нам даў магчымасць дарма карыстацца памяшканнямі. У нас і моўныя заняткі — іх вялі настаўнікі беларускага ліцэя, для пачаткоўцаў і для тых, хто ўжо больш-менш ведае мову, і заняткі па культуры, гісторыі, азнаямленне з рэаліямі жыцця беларусаў. Пакуль у нашай школе чатыры чалавекі. Гэта не дзіўна, паколькі пачалі мы рэкламаваць яе толькі ў сакавіку. У наступным годзе будзе больш зацікаўленых. У нас ёсць розныя ўзроўні цікавасці да гэтай тэматыкі. У нас ёсць адзін дактарант універсітэта правінцыі Альберта ў Канадзе Пэр Рудлінг, швед па паходжанні, грамадзянін Швецыі і ЗША. Ён абараніў дысертацыю па гісторыі беларускага нацыянальнага руху, раней больш займаўся ўкраіністыкай. Сярод нас ёсць Джасцін Ралі, Гейдзі Лернеган — гэта ў яе продкі з Ашмяншчыны, прозвішча ў яе ірландскае, і яшчэ адна дзяўчына, яна здабыла ступень бакалаўра ва ўніверсітэце Ватэрлу ў Канадзе — Джозефін Малдасі, прозвішча ў яе італьянскае. Вельмі цікавыя людзі. Джасцін атрымала ўжо доктарскую ступень па неўралогіі якраз вясной, але больш за год займаецца беларускай мовай, раней вывучала рускую мову, яшчэ раней самастойна вывучыла старажытнакітайскую. Што цікава, да беларусаведы не мела яна ніякага дачынення. Проста захацелася ёй займацца беларускай мовай, бо ў яе там, у Паўночнай Караліне, ёсць беларускія сябры і частка з іх размаўляе па-беларуску.

— Заняткі праводзіліся тры гадзіны раніцой, моўныя (вёў заняткі найбольш Ян Карчэўскі, карысталіся мы ягонымі падручнікамі па беларускай мове і літаратуры), тры гадзіны пасля поўдня — найчасцей лекцыі, у большасці па-англійску, — працягвае доктар Вулгайзер. — Да нас прыязджалі розныя спецыялісты, між іншым Алег Латышонак чытаў некалькі лецый па беларускай гісторыі, Ян Максімюк з Прагі чытаў лекцыю пра сучасную беларускую літаратуру ў палітычным кантэксце ды пра праект стварэння літаратурнага варыянта сваёй мовы, Андрэй Дынько з „Нашай Нівы" расказваў пра сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі, Ілона Карпюк — пра беларускі рок. Студэнтам было цікава на Падляшшы асабліва таму, што тут каля Гайнаўкі гаворкі адрозніваюцца істотным чынам ад літаратурнай мовы.

Сустракаліся з мясцовымі навукоўцамі, літаратарамі, дзеячамі, былі ў Трасцянцы, Нарве, Бельску, Студзіводах, Драгічыне і Мельніку, у Супраслі і на Грабарцы, у Сейнах, наведалі беластоцкі ўніверсітэт, рэдакцыі „Нівы", Радыё Рацыя, тэлебачанне, Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, трапілі на лагер, які праводзіў Звяз беларускай моладзі, і на „Басовішча". Праграма была вельмі насычана. Маглі пачуць дух Белаточчыны.

Джасцін Ралі:

— Першая мая адукацыя была ў вобласці музыкі. Другая — неўрафізіялогіі. Для мяне мовы гэта хобі. Мне падабаецца вывучаць мовы, асабліва славянскія. Мне, напрыклад, не была цікава французская мова, хоць я яе вывучыла. Мне хацелася вывучыць рускую мову. Але ў той час у нас не было рускамоўных людзей. Калі паявіліся там, дзе я жыву, я пачала з імі размаўляць. Я хацела вывучыць мову сур'ёзна. Некалькі маіх знаёмых было з Беларусі. Я пачула ад іх беларускую мову і яна мне вельмі спадабалася. Я самастойна вывучала рускую мову шэсць месяцаў, ад пяці гадоў працягваю вывучэнне рускай мовы. Першая мая настаўніца была з Сібіры, цяпер яна лектар універсітэта. Другая мая настаўніца была з Мінска, яна сястра майго сябра. Мы праводзілі заняткі па беларускай мове два-тры разы ў тыдзень. Вывучала я беларускую мову праз скайп ужо два гады. Цяпер мая настаўніца на вёсцы, няма ў яе інтэрнэтнай сувязі. І цяпер я трапіла ў каледж, дзе працягваю сваё хобі.

Студэнты летняй школы пасля працы на Беласточчыне паехалі на два тыдні ў Беларусь. Праз год будзе іх, мабыць, больш, і праграма яшчэ багацейшая.

У Гайнаўскім белліцэі з Іалантай Грыгарук (першая справа). За камп'ютарам Джасцін Ралі

Моцныя заднім ходам

Вось прайшлі выбары ў Еўрапарламент і маем у ім на найвышэйшым зэдліку Ежы Бузка. Некаторыя з гэтай нагоды цешацца, а я радавацца гэтым не магу. Прычынай гэтаму з'яўляецца мая добрая памяць, якой многім выбаршчыкам не хапае. На маю думку, гэты пан павінен сёння знаходзіцца ў іншай ссылцы, а, наогул кажучы, у палітычным забыцці. Быўшы нашым прэм'ерам, за час кіравання нашай краінай пакінуў неверагодны балаган. Быў адным з арганізатараў чатырох рэформ, з якой найбольш „удалай" можна палічыць рэформу службы здароўя. А найбольш дэфектным дзіцём Ежы Бузка з'яўляецца нерэфармавальная карыкатура Нацыянальнага фонду здароўя (НФЗ). „Грошы пойдуць за пацыентам" — гэта рэха пустых, як у хуткім часе выявілася, абяцанак, якое не перастае палохаць і праследаваць усіх тых, якія не маюць упэўненасці ў бясплатным лячэнні. Бо няма грошай не толькі ў іх кашальку.

Гэты пан з пагардай паставіўся да хворых і старых грамадзян, сказаўшы: „Зашмат нас (дзяржаву) каштуюць пенсіянеры", і з'яўляецца хросным бацькам сістэмы, якая „надзвычай добра спраўляецца".

У такой сітуацыі я, грамадзянін і падаткаплацельшчык, не магу цешыцца абяцаннямі, што хутка ў нашай краіне наступіць адносная нармальнасць. Грамадскасць Польшчы на нармальнасць проста не заслугоўвае. Не хачу тут зневажаць усіх разважлівых людзей, але дайшло да такога, што вялікая група грамадзян (больш за 300 тысяч галасоў аддалі на Ежы Бузка на выбарах у ЕП) падтрымала няўдачніцтва і бессаромнасць палітыка. Пакіне ён такі ж балаган у ЕП? У такой непрадказальнай краіне, як наша, усё можа здарыцца... Ні адзін парламент у свеце не маліўся ў XXI стагоддзі за дождж, а наш гэта зрабіў. І дождж пайшоў, аднак не тады, калі трэба было яму ісці...

Ніхто з вучоных і простых людзей не выдумаў „цудоўнага слова", якім можна было б акрэсліць сапраўдную рэчаіснасць у нашай з малочнымі рэкамі з кісельнымі берагамі краіне...

Мы — большасць — разумныя заднім ходам.

Сцяпан КАРБОЎСКІ

Нараўчанская гміна

Па асфальце да возера

Сёлета ў першай палове жніўня на тэрыторыі Нараўчанскай гміны здалі ў карыстанне 2 830 метраў асфальтавай дарогі. Вядзе яна ад ваяводскага шляху з Юшкавага Груда ў Навасады цераз Новае Ляўкова ў Стары Двор ля Семяноўскага возера (тут летам праводзяцца рэгаты, сюды прыязджае ўсё больш ахвотных пакатацца на лодцы або пакупацца). Раней тут была гравейка. Зараз гэтая асфальтавая дарога мае пяць метраў шырыні, а ўздоўж берага возера — 6 м. Пабудавалі яе за гмінныя і еўрасаюзныя сродкі.

Дарога бяжыць амаль на ўсёй сваёй даўжыні цераз сасновы лес (у гарачы дзень тут стаіць водар смалы і здаровы пах жывічнага паветра), а перад возерам паварочвае ўправа на пляж. Новая дарога паспрыяе таму, што больш турыстаў ды жыхароў гарадоў прыедзе сюды ў глухамань, каб адпачыць ад гарадоской мітусні.

(яц)

Гінуць як на вайне

Аляксей МАРОЗ

Апошнім часам штораз часцей чуем аб дарожна-транспартных здарэннях, у час якія людзі гінуць або трапляюць у бальніцу. У Польшчы на дарогах гіне 5-6 тысяч людзей штогод, а раней у выніку дарожна-транспартных здарэнняў паміраў нават па 6-7 тысяч чалавек у год. Гэтая вясна і лета былі асабліва небяспечнымі для жыхароў Гайнаўшчыны. Нават епіскап Міран перасцерагаў у пропаведзях у Свята-Троіцкім саборы гайнавян і прыезджых, каб перамяшчаліся на машынах толькі з дазволенай хуткасцю і прытрымліваліся правіл дарожнага руху.

Разбіты ў час выпадку каля Трасцянкі аўтамабіль з'яўляецца перасцярогай для іншых карыстальнікаў дарог і сведчыць, што ніхто не можа спаць спакойна перад выездам з дому

Лепш спазніцца

— Калі выедзеш з дому запозна, едзь так, каб даехаць на месца прызначэння таксама спозненым, бо калі будзеш хацець не спазніцца, то можаш увогуле не даехаць, — заявіў епіскап Міран у час пропаведзі. Калі нядаўна паліцыянты затрымалі вадзіцеля са Швецыі, які ехаў з хуткасцю больш за 210 кіламетраў у гадзіну, тлумачыў ён, што прывык ездзіць па аўтастрадах Германіі, дзе няма абмежаванняў хуткасці і з прывычкі прыціснуў нагу на педаль і ў Польшчы. У Гайнаўскім павеце якраз недазволеная хуткасць з'яўляецца самай частай прычынай цяжкіх выпадкаў, у якіх гінуць людзі. Іншымі прычынамі дарожных аварый бывае выконванне манеўраў у недазволеных месцах ці знаходжанне за рулём нецвярозых вядзіцеляў.

— Адсутнасць уяўлення небяспекі, намнога перавышаная хуткасць, апярэджванне пад гару і на паваротах. Падумайце аб іншых вадзіцелях, — напісаў адзін з інтэрнаўтаў пасля смерці трох мужчын, адзін з якіх выводзіўся з Койлаў, загінуўшых 6 жніўня ў дарожнай аварыі побач Трасцянкі. Аднак покі няма яшчэ канчатковых вынікаў расследавання ў справе гэтага выпадку, зараз зарана гаварыць аб канкрэтных правінах (у гэтай аварыі сутыкнуліся дзве машыны), так як рабілі гэта некаторыя журналісты, ці нават інтэрнаўты на падставе замешчаных у інтэрнэце здымкаў. Пісалася, што вельмі вялікая хуткасць машыны, у якой ехалі загінуўшыя, была прычынай аварыі побач Трасцянкі, але да гэтага дарожнага здарэння магла таксама спрычыніцца аварыя машыны, якую хутчэй за ўсё раней выкінула на абочыну дарогі. Паліцыянты дакладна спраўджалі тое, што асталося з аўтамабіляў пасля дарожнай аварыі каля Трасцянкі. У супастаўленні гэтага са слядамі на дарозе і з размовамі са сведкамі здарэння можна будзе даць больш верагодныя меркаванні наконт гэтага выпадку.

— Гэты адрэзак дарогі (на якім дайшло да аварыі побач Трасцянкі — А. М.) мае вельмі дрэннае мінулае. Там 2 кіламетры простай дарогі, лёгка з горкі і вельмі добрая бачнасць, — пісаў іншы інтэрнаўт. Калі я чытаў гэтае выказванне ўспомніў, што ў Расіі было такое месца, дзе вельмі часта здараліся дарожныя аварыі. Пазней высветлілася, што якраз на гэтым адрэзку дарогі магло знаходзіцца паганскае капішча. Пасля адслужэння малебна на гэтай дарозе і асвячэння няшчаснага адрэзка, не было ўжо там частых дарожных выпадкаў. Можа і цяпер можна было б адслужыць малебны і асвяціць дарогі на тых адрэзках, дзе часта здараюцца дарожныя выпадкі.

У Койлах зараз вясковая жалоба. Пасля пахавання мужчын людзі з гэтага сяла і суседніх вёсак моцна смуткуюць па загінуўшых побач Трасцянкі і спачуваюць іх сямейнікам. Нядаўна глыбокая жалоба ахінула Гайнаўку пасля смерці айца Тамаша Леўчука, які памёр пасля дарожнага выпадку на дарозе Бельск-Падляшскі — Гайнаўка. Пазней у Чыжоўскай гміне праводзілі на могілкі жанчыну з Лянева, якая загінула ў час дарожнай аварыі. Старэйшы жыхар Лянева, едучы ў пачатку гэтага лета на сваім трактары з жонкай, не трапіў дакладна на масток, пад якім плыве невялічкая ў гэтым месцы рэчка. Трактар перакуліўся набок, а ў ім у закрытай кабіне апынулася ў вадзе сужонства. Жанчына ўтапілася, а яе мужа, у якога толькі галава выставала па-над ваду, знайшоў жыхар чыжоўскага блока, які прыехаў лавіць рыбу. Скочыў ён у ваду, разбіў шыбу ў трактары і выцягнуў з вады перапалоханага мужчыну, які вельмі дзякаваў выратавальніку. Гэтае здарэнне таксама перасцерагае, каб быць асцярожным нават на палявых дарогах, па якіх ездзяць сельскагаспадарчыя машыны. Толькі ў першым паўгоддзі 2009 года ў Падляшскім ваяводстве было зарэгістраваных 1150 выпадкаў у сельскай гаспадарыцы, у выніку якіх загінула ажно 5 асоб, а 80 сталі інвалідамі. Прычынай больш чым паловы гэтых выпадкаў быў перавоз людзей у прычэпах, на трактарных крылах ці стоячых ззаду трактара. Вядомыя і на Гайнаўшчыне выпадкі, калі людзі падалі з прычэпаў ці вазоў з саломай або сенам на зямлю і траплялі ў бальніцу, а некаторыя паміралі.

— На 14 кантраляваных камбайнаў, ува ўсіх мы знайшлі сур'ёзныя няправільнасці (небяспечныя для здароўя і жыцця працуючых). Гаспадары прасілі, каб не марочыць ім галаву пра небяспеку, бо стаіць сонечнае надвор'е і ім трэба працаваць, — заявіў адзін з кантралёраў.

Меншыя аварыі таксама перасцярогай

6 жніўня на Керамічным прадпрыемстве ў Старым Ляўкове ў час пагрузкі цэглы ваганетка сутыкнулася з 46-гадовым веласіпедыстам, які са зламанымі нагой і ключыцай быў перавезены ў бальніцу. 10 жніўня 27-гадовы гайнавянін наехаў машынай на 15-гадовага юнака (таксама гайнавяніна), які ехаў на мапедзе і на вуліцы Ліпавай хацеў павярнуць улева. Хлопца са зламанай нагой і сінякамі забралі ў бальніцу. 12 жніўня праўдападобна зляцеў ланцуг у матацыкле, на якім 61-гадовы чалавек ехаў па дарозе Дубіны — Катоўка. Перавярнуўся ён на бок і ўпаў у роў. Мужчына са зламанымі рэбрамі і з сінякамі быў перавезены ў шпіталь. Таксама 12 жніўня двух мужчын, 27-гадовы, які меў 2,2 прамілі алкаголю ў крыві і 29-гадовы, у якога было 3 прамілі алкаголю ў крыві ўехалі ў Бандарах на аўтамабілі ў кусты і затрымаліся на плоце. Малодшы з сінякамі трапіў у бальніцу, а старэйшы цверазеў без шпітальнай дапамогі. Адзін з іх не меў увогуле вадзіцельскіх правоў, а другі страціў іх раней. Хаця ў гэтых апошніх выпадках не загінулі людзі, то паказваюць, што ўсюды, у розных месцах на дарогах падсцерагае нас небяспека і ніхто не можа сказаць, што ездзіць згодна з дарожнымі правіламі і таму можа спаць спакойна. Калі нехта едзе правільна, то можа наехаць на яго іншы вадзіцель. Калі ў час даўжэйшых выхадных паліцыянты спраўджаюць вадзіцеляў на цвярозасць, за некалькі дзён затрымліваюць у сярэднім пад тысячу нецвярозых асоб.

Некаторыя гавораць, што ў сённяшнім свеце не самыя страшныя войны, а больш за іх дарожныя аварыі, у якіх гіне намнога больш людзей, чым на полі бою. Паводле рапарта Галоўнай камендатуры паліцыі ў 2008 годзе здарыліся ў Польшчы 49 054 дарожныя выпадкі, у якіх загінула 5 437 асоб, а раненых было 62 097 асоб. Апрача гэтага ў 2008 годзе было зарэгістраваных 381 520 дарожна-транспартных здарэнняў.

Помнік на мяжы

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Палова верасня 1960 года, дакладна субота 18 верасня. Больш як дзесяць гадоў мінула, як канчаткова была ўстаноўлена пасляваенная мяжа паміж ПНР і СССР, у тым з яго беларускай рэспублікай. Перасяленцы ўжо звыкліся са сваімі новымі ваколіцамі, з гэтага і таго боку мяжы. „Беластоцкая газета" інфармуе: на саміце ААН чакаецца Владыслаў Гамулка, у Беласток прыбывае партыйная дэлегацыя з Гродзеншчыны. Намеснік галоўнага рэдактара „Гродзенскай праўды" Андрэй Колас у гэтым выданні „Беластоцкай" публікуе тэкст „Савецкі чалавек", добра аценьваны тагачаснымі ўладамі пісьменнік Аляксандр Амільяновіч крыху гістарычна прыдуманую аповесць „Арліны палёт", а ў зале беластоцкага кінатэатра зайграе Ванда Вілкамірская.

Генконсул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык, Казімір і Францішка Шаршуновічы

Тым часам 18 верасня 1960 года на прысёлку Завелдажнік каля вёскі Беразіна грамадскім высілкам быў узнесены помнік памяці васемнаццаці савецкіх партызан і двух мясцовых, што загінулі ў сутычцы з гітлераўцамі ў заснежанае 4 сакавіка 1942 года.

Сёння Завелдажнік гэта лес. Назва засталася толькі на старых картах.

— Калісь былі тут палеткі і стаялі дамы. Сёння ўсё зарасло дрэвамі, — расказвае Багдан Дудко з блізкай Цісоўкі, што распаложана каля Беразіны, з другога боку прысёлка і вёскі Залешаны. Багдан Дудко са знаёмымі пад лясным помнікам часам запальвае знічы, адгортвае лісце. Чаму?

— Хтось жа мусіць аб гэтым памятаць, — пераконвае.

У Беразіне жыве толькі двое пажылых людзей — сястра і брат Францішка і Казімір Шаршуновічы. Ёй 83 гады, яму — 80. Не выглядаюць на свой век.

— Мы засталіся тут, бо нам тут добра, добрае паветра. З Залешан пасля вайны нам загадалі аднойчы перасяліцца сюды. Мы не ведалі, у чым справа. Забралі нам з таго боку ўсё: дом, дабытак, зямлю. Ну, нейкую кароўку ці каня мы забралі з сабой. У Польшчы сядзелі мы кутам у людзей. А калі згэтуль кагосьці забралі на той бок мяжы, і стаялі пустыя хаты, можна было сяліцца туды. Спачатку за забраны дабытак не плацілі, толькі намнога пазней далі кампенсацыю. Больш за ўсё мужчыны хацелі ў Польшчу, бо там забіралі да працы далей у Расію, — успамінае пані Францішка.

Яе брат:

— У той сакавік 1942 года нямецкі патруль з Белавежы трапіў на партызанаў па слядах крыві. Партызаны ішлі да свайго схову з раненым канём і заколатым парсюком. Акружылі іх. Дайшло да стралянiны і немцы іх выцупалі. Забілі мясцовых: Аляксандра Ягорава і Валодзю Янеля. Застрэлілі яшчэ аднаго ўкраінца, які ішоў з фронту, бо тут, па вёсках, калі з фронту ішлі, дык заставаліся ў вёсках, памагалі гаспадарам за харчы.

Пані Францішка: — Тут так моцна біліся, што высокі сасновы маладняк быў пасечаны да паловы!

Пан Казімір: — Кажуць, засталіся тыя, хто быў тады на стражы. Ці яшчэ жыве хто з іх, невядома.

Каб дастацца пад помнік на Завелдажніку, трэба прайсці пешшу з паўкіламетра. Самаход сюдою не пераедзе, мусіў бы праціснуцца пад вельмі нізкім чыгуначным мастком, па якім час ад часу праязджаюць таварныя цягнікі з Семяноўкі ў бок Свіслачы і Ваўкавыска. Пару соцень метраў далей — мяжа і гэты помнік, мабыць найдалей распаложана такая памятка пры польска-беларускай мяжы. Казімір Шаршуновіч:

— Там, дзе ён цяпер стаіць, пахаваны пасля 1942 г. толькі Аляксандр Ягораў. Іншыя магілы былі ў трох месцах, бліжэй Беразіны. Зараз пасля вайны іх згэтуль забралі. Дзе іх пахавалі, ніхто тут у ваколіцы не ведае. Мабыць, на якімсьці могільніку. А імён партызанаў не ведае ніхто.

Багдан Дудко:

— Ужо здаўна ніхто пад гэты помнік не прыязджае. Апрача паляўнічых, не паяўляецца тут ніхто.

Пад помнік у Завелдажніку прыехаў некалькі дзён таму генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхал Аляксейчык. Даведаўся аб ім ад нас. Консул вядомы клопатам за магілы з часу II сусветнай вайны на Беласточчыне і так, як на гарадскім могільніку ў Беластоку і жаўнерскім у Саколцы з фундавання памятных крыжоў. Неаднойчы паўтарае, сустракаючы фармальныя цяжкасці з польскага боку:

— Нельга ж маліцца за ўпакой загінуўшых, пахаваных на гэтых могільніках, да серпа і молата! Прыстоіць крыж.

Хоць сам вайны не памятае, яго сям'ю таксама яна кранула. Загінулі два ягоныя дзядзькі. Бацька прайшоў з фронтам ад Масквы да Прагі. Праблема з апекай пад магіламі, у якіх пахаваны беларусы загінуўшыя ў час вайны, звязана таксама з тым, што на пачатку 90-х гадоў адказнасць за ўсе некраполіі, у якіх спачываюць грамадзяне былога СССР, узяла на сябе Расійская Федэрацыя і з яе прадстаўнікамі трэба кансультавацца ў гэтых справах, што, бывае, цягнецца месяцамі. Калі мы наведалі Завелдажнік і ваколіцы, консул падзяліўся з намі свамі роздумамі аб гісторыі, той звязанай з 1 верасня, і той, звязанай з наступствамі 17 верасня 1939 года:

— Усё трэба разважыць і выбраць залатую сярэдзіну. Пазнаць рацыі таго і другога боку. Няма тае адзінай праўды. Кожны, вядома, бароніць свае рацыі, але ў гістарычным мышленні трэба захаваць незалежнасць. Ведаю, што адноўлены магілы ахвяр 17 верасня хоць бы ў Брэсцкай вобласці. Няма супраціву такога тыпу дзеянням.

Лясны помнік пад Беразіной зарастае мохам. Агароджа распадаецца. Літары на табліцы сцертыя. Прысутны з „Нівай" і консулам пад помнікам Раман Каліноўскі з Гарадской управы ў Міхалове запрапанаваў:

— Можна было б паставіць указальнікі, што тут ёсць помнік. Ды ці хто сюды прыедзе?

— Напэўна трэба паправіць агароджу, — упэўнены Багдан Дудко.

Пад помнікам на Завелдажніку (злева): Багдан Дудко, Казімір Шаршуновіч, Раман Каліноўскі і генконсул РБ Міхал Аляксейчык

Генкосул Аляксейчык: — А калі б перанесці яго на могільнік у Гайнаўку?

Раман Каліноўскі: — Але ж гэта мае значэнне для гэтага месца, што тут штосьці здарылася. Можа, хтосьці сабе прыгадае аб тым, што тут адбылося?

Казімір Шаршуновіч:

— Калі сюдою ездзілі цягнікі, тут была дарожка і людзі сюдою пераходзілі. Цяпер тае дарожкі ўжо няма.

Генкосул заклікае:

— Можа, хтосьці яшчэ жыве з таго партызанскага атрада, можа, тыя, што ў той час засталіся на стражы?

Калі вяртаемся ў Беласток, Раман Каліноўскі прызнаецца „Ніве":

— Кажуць, у нашай гміне найбольш такіх помнікаў, прысвечаных палеглым у змаганні з гітлераўцамі. Параскідваны яны па лясах, палетках, пры дарогах. У рэгістрах ёсць іх у нас дзесяць, але, мабыць, іх значна больш.

Як мы ішлі галасаваць

Панаслухваемся ў тэлевізары як спрачаюцца палітыкі. Да выбараў і не толькі да іх. Вось дэпутат Палікот бэсціць прэзідэнта і абзывае яго п'яніцам, бо той купляе шмат алкагольных напояў, ды патрабуе ад яго тлумачэнняў перад народам, нашто выдае грошы на алкаголь, альбо каб прадставіў дакумент, што не з'яўляецца алкаголікам. Брат прэзідэнта, лідар ПіС, у адказ кідаецца на дэпутата, якога лічыць памешаным, і на ўсю ГП, якой сябрам з'яўляецца Палікот... А мы самі разбіраемся і гутарым, што і як. Бо ж выбары...

Задумаў я быў пагаварыць з жыхарамі сваіх Бялок ды суседніх Агароднікаў і Рагазоў-Іванкоў. Пытаўся, ці людзі пойдуць на еўравыбары. „Не пайду галасаваць, бо не маю на чым даехаць у гміну і ў Беласток!"; „Не буду галасаваць на гэтых ашуканцаў"; „Не пайду галасаваць, бо яны не выконваюць давыбарчых абяцанняў!"; „Не буду галасаваць, бо войт выдаў грошы на планы асфальтаванай дарогі з Бялкоў у Іванкі, нават абяцаў зрабіць дарогу ў 2009 годзе, а не думае аб пабудове дарогі, а тыя грошы забралі на іншую дарогу!"; „Не пайду галасаваць, бо войт на выбары не дасць аўтобуса, а потым не будзе на чым даехаць ані ў гміну, ані ў Беласток!"; „Не пайду галасаваць, бо мы тут жывем як малпы!"... Толькі адна асоба адказала, што пойдзе на галасаванне, бо гэта грамадзянскі абавязак. А я моцна засумаваў. Самі пра сябе не хочам дбаць і не хочам, каб за нас людзі вырашалі нашы справы. І праўда гэта, што пра наш куточак, за нашу малую айчыну ніхто не клапоціцца — ані войт гміны, ані стараста павета, а мы самі не ў сілах што-колечы зрабіць...

Наступныя выбары — не за гарамі.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Рашылі праблему

Прадпрымальнік з Орлі купіў участак поля ў Вульцы-Тэрахоўскай і арганізаваў там жвіроўню. Гравій возіць грузавым аўтамабілем-самазвалам праз Кузаву. Жыхары вёскі скардзіліся, што папсаваў ім дарогі. Калі я паспрабаваў высветліць справу ў гміне, дык войт засцярог, каб яго не мяшаць у гэтую справу. — Валяне пачаткова прад'явілі мне засцярогу, — канстатаваў войт, — каб не даваць канцэсіі прадпрымальніку на арганізаванне жвіроўні, але гэты абавязаўся, што пасля заканчэння вывазкі прывядзе дарогу ў стан належнага парадку... Затым і справа была належным чынам уладжана.

Войт, аднак, абяцаў перагаварыцца з шафёрам-прадпрымальнікам, ды і мне рэкамендаваў такую размову правесці. Яшчэ ў гэты ж дзень справа была вырашана. Пасля нашых размоў калдобіны на дарозе ад Міхала Канарэўскага ў напрамку Апакі (побач леснічоўкі) і з Кузавы ў Вульку-Тэрахоўскую (за сядзібай Сяргея Рэпкі) былі папраўлены. Калдобіны засыпаны жвірам, а горбы пяску выраўнаны экскаватарам. Як мне паясніў арлянскі прадпрымальнік, жвіроўняй будзе карыстацца сем гадоў і не хоча папсаваць сваёй рэпутацыі ў асяроддзі. Абяцаў сялянам прывесці дарогі ў належны парадак і слова стрымае. **(ус)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Разам з татам

Яраслаў, Магда і Габрыся Карбоўскія робяць гайданку

Сярод уквечанага падворка ў Гайнаўцы па вуліцы Герояў Варшавы кіпіць праца. Гэта Габрыся і Магда Карбоўскія заказалі гайданку ў таты Яраслава, і не толькі заказалі, але дапамагаюць яе зрабіць. Яна вялікая, драўляная, на дзвюх моцных нагах з падпоркамі, з шырокім седалам, дзе змесцяцца і дзяўчаткі, і іх тата Ярак і мама Мірка, а яшчэ было б месца і для бабці Ніны з дзедкам Сцёпам!! Вось так! Праект быў выдатны. А тата і дзед — майстры: яны самі і дом паставяць, і абсталююць усё ў ім! Зробяць што хочаш у свеце! І тут прылады як трэба — пілы, гайкі, свёрлы, лінейкі... Гэта першая ў татавым жыцці гайданка, якую робіць уласнымі рукамі! Прататып. Калісь зрабіў з бацькам нават машыну для вугля. А працуе пажарнікам. Мама Мірка — медсястра. А дзед Сцяпан — кім ён не быў! — можа ўсё гэта апісаць.

— А мы ўсёй сям'ёй верш напісалі, пра вясну! — смяецца Габрыся. Значыцца, усе тут майстры на ўсе рукі. „Прыйшла вясна- красна... Сонца мацней свеціць, ідуць гуляць дзеці... Тата з мамай у агародзе працуюць, градкі для раслінак рыхтуюць... Пташкі прыгожа спяваюць, свае хаткі прыбіраюць..." Усё як бачыцца з падворка: і вялікі агарод, у якім цяпер буяе і пахне зеляніна, і прырода, хоць амаль у цэнтры Гайнаўкі, — як на вёсцы.

Дзяўчаткі ходзяць у школу № 6 у Гайнаўцы, на „Мазурах". Габрыся ўжо пойдзе ў другі клас. У першым класе паспяхова выступіла з вершыкам на дэкламатарскім конкурсе. Увесь клас (30 асоб) рыхтаваўся да конкурсу. Габрыся выбрала вельмі прыгожы вершык пра коціка, хоць у яе няма сваіх коціка і сабачкі. А старэйшая ад яе на шэсць гадоў сястрычка Магда ўжо даўно вывучала ў „шостцы" беларускую мову, і цяпер ужо ідзе ў гімназію, якая месціцца пры гэтай самай школе. Пасля, вядома, збіраецца ў гайнаўскі беларускі ліцэй. Магду захапляе танец — яна прымала ўдзел у розных конкурсах ужо па-за Гайнаўкай і можа пахваліцца шматлікімі кубкамі, медалямі і дыпломамі пераможцы. Вучыцца танцаваць няцэлы год. „Найбольш прыкладваюся да танцаў!" — кажа Магда, але школьнае пасведчанне ў яе з чырвонай палоскай, а па беларускай мове — шасцёрка!

Габрыся, калі прыедзе ў вёску бабулі — Дабрываду ці дзедкаву — Чахі-Забалотныя, яшчэ крыху сароміцца гаварыць па-беларуску, таму што там іншыя гаворкі. Бабуля паказала кніжку, дзе надрукавана дзедкава апавяданне пра колішні час якраз у Чахах — зборнік „Панароўе", дзе змешчаны найлепшыя празатарскія творы беларускіх аўтараў з Падляшша. Дык дзедка гэта пісьменнік?! А, здавалася, пісьменнікі толькі ў кніжках і на партрэтах на школьных сценах!.. „Наш дзедка такі... звычайны. Дык ён такі важны!?" — глядзяць унучкі на пана Сцяпана і зараз пабягуць на другі паверх свайго дома... штосьці самі напісаць! А пакуль што — запрашаюць на новую гайданку!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Няма прыгажэй

Высозныя сосны
адвечнага бору —
пад саме сонца,
пад самыя зоры.
Зубры
ў гушчары
пратапталі сцяжыны
туды,
дзе ніводнай
няма каляіны.
Маліны
даспелыя
просяцца ў жмені
грыбы — у кашы,
бы ў загоне алені.
Вітаюць нас
птушкі і дрэвы гасцінна...
Ну дзе яшчэ знойдзеш
такія мясціны?
Усім на зямлі
я давесці бяруся:
няма прыгажэй
ад маёй Беларусі!

Артур ВОЛЬСКІ

Старажытны горад Бельск (2)

Знаходзячыся на бельскім гарадзішчы і прыглядаўшыся рэчцы Любцы і вуліцы Замкавай, варта надалей узгадваць гісторыю старажытнага Бельска.

Вельмі значным момантам у сярэднявечнай гісторыі Бельска быў 1320 год, калі горад разам з усім Падляшшам апынуўся ў межах Вялікага Княства Літоўскага. Жыхары тагачаснага Бельска ў галоўным займаліся ганчарствам ды апрацоўкай касцей. Знойдзеныя тут археолагамі фрагменты глінянага посуду лічацца ў дзесяткі тысяч.

У 1410 годзе, падчас славутай бітвы пад Грунвальдам, у склад двух падляшскіх харугваў уваходзілі таксама бельскія воі. Два гады пасля бітвы нейкі час пражываў у бельскім замку кароль Уладзіслаў Ягайла. Гэты факт можа сведчыць аб значнай ролі Бельска ў гэты час. Аднак найбольшым штуршком для яго росквіту стала магдэбургскае права, нададзенае Аляксандрам Ягелончыкам у 1495 г.

З Замкавай гары шпацыруем найстарэйшай вуліцай горада — Замкавай. Археалагічныя раскопкі пацвердзілі старажытнасць Бельска. Сённяшняя вуліца Замкавая — асаблівая. Хаця вуліца знаходзіцца амаль у цэнтры горада, стаіць па ёй многа прыгожых драўляных дамоў. Калі дойдзем да канца вуліцы Замкавай, нашым вачам пакажуцца два вельмі важныя аб'екты: комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы і, перш за ўсё, белліцэй.

Замкавая гара

Пачаткі II Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Бельску сягаюць 1944 года, калі была створана 4-гадовая беларуская гімназія ды 2-гадовы ліцэй. У 1946 годзе дырэктарам школы стаў Яраслаў Кастыцэвіч, які па сённяшні дзень лічыцца адным з найбольш заслужаных для школы. Між іншым дзякуючы яго намаганням знойдзена было месца пад новы будынак школы, у якім знаходзіцца яна па сённяшні дзень. Яраслаў Кастыцэвіч славуты таксама тым, што ездзіў па беларускіх вёсках Падляшша і заахвочваў маладых людзей паступаць у бельскі белліцэй. Жыхары горада належным чынам ацанілі асобу Яраслава Кастыцэвіча і комплексу школ, які знаходзіцца побач ліцэя, прысвоілі яго імя.

Бельскі белліцэй асацыюецца з непаўторнай атмасферай і высокім узроўнем навучання. Вучыліся ў ім у галоўным сялянскія дзеці з наваколля Бельска. Сёння большасць вучняў складаюць жыхары Бельска, але беларускі характар школы ўсё ж такі не памяняўся.

З ліцэя падаемся на вуліцу Ягелонскую. Тут, амаль побач ліцэя, знаходзіцца царква Нараджэння Прасвятой Багародзіцы — найстарэйшы храм горада. Цікава, што першапачаткова знаходзілася яна на тэрыторыі бельскага замка. Калі была перанесена? Чаму? Аб гэтым чытайце ў наступнай частцы цыкла.

(працяг будзе)

Міхась СЦЕПАНЮК

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ПРАВІЛЬНА ТРЭБА ЗНАХОДЗІЦЬ І... НЕ ГУБЛЯЦЬ

...А яшчэ бывае так, шаноўныя мае, што шанцуе чалавеку ну проста з самае раніцы. Як у той дзень Зеніку. Не паспеў ён выйсці за веснічкі, не паспеў ступіць і некалькі крокаў, як раптам...

На тратуары побач з ягоным домам ляжала сабе ды ўсміхалася — самая што ні на ёсць стозлатовачка. Так, так, тая самая купюра-паперына, з выявай караля Ягайлы, і за якую можна набыць тагосяго не так ужо і мала, калі разабрацца.

Зенік нахіліўся, падняў, сам усміхнуўся насустрач такой вось ранішняй госцейцы-нечаканцы побач з ягоным домам. Але ўсміхнуўся не сказаць каб і дужа весела: штосьці яго болей турбавала, чым радавала. Можа, усведамленне, што хтосьці згубіў тыя грошыкі, і цяпер расстройваецца, а можа... зусім іншае чакаў ён знайсці, калі выйшаў за парог дома?!.

Вось так ён шыбаваў па мястэчку, разпораз кранаючыся кішэні, дзе ляжала акуратна складзеная стозлатоўка; і — сум па-ранейшаму не пакідаў яго. Не пакідаў да таго самага моманту, пакуль... (О, як жа любіць ваш дзядзечка гэтыя „пакуль...", „і раптам!..", „у той самы момант!..."). Гэта значыць, нешта нечакана зрушваецца на гэтым свеце, і адбываецца — таямніца, неверагоднае, казачнае і нечаканае.

Менавіта ўсё гэта і адбылося. Адбылося ў той самы момант, калі ён павярнуў на чарговую вулку, даволі вузкую і прахалодную ад разгалістых старых ліпаў, ды з-за вузкасці той вулачкі і яшчэ нечага, што словамі не перадаць, аніяк не мог размінуцца з дзяўчынкай, якая проста ішла насустрач і, здавалася, стварала яшчэ большую прахалоду навокал.

„Я шукаў цябе ўсё жыццё!" Калі вы не верыце, што менавіта гэтыя словы прыйшлі першымі ў голаў Зеніку ў той момант, калі яны параўналіся і раптам спыніліся побач — і зусім не таму, што вулачка была надта вузкаю, — дык абсалютна дарма, мае мілыя. Але ў тую хвіліну Зенік іх не сказаў. Сказаў потым, пазней, калі беспамылкова ўжо ведаў, што не згубіць гэтую ўсмешлівую, светлую, гарэзную, дзіўную, дарагую і казачную дзяўчынку — аніколі.

У чым сакрэт таго дакладнага ведання і ўпэўненасці? Гм!.. Я пытаўся ў Зенікa. Аднак той толькі рассмяяўся, ды замест адказу ўрачыста ўручыў знойдзеную ім у той дзень стозлатоўку.

Ваш дзядзечка Сід

24 ліпеня 2009 г., Кобрын

Музыка з кайфам

Беларуская экспансія

Ад нейкага часу можна адчуваць уражанне, што беларускіх музыкаў у свеце паважаюць штораз больш. Ці гэта доказ павышэння музычнага ўзроўню нашых выканаўцаў, ці проста доказ раскрывання Беларусі для розных відаў мастацтва — не такое важнае. Галоўнае, што чуем беларускае слова часцей, гусцей і паўсюдна. Не так даўно, бо ў мінулым годзе, рэвалюцыйным для беларусаў стаў фестываль у Вэнгажэве. Свой пачатак бярэ ён яшчэ ў 1991 годзе (хаця яго выданняў было намнога менш чым Басовішча), але калі глядзець, што гэта польскі фестываль, дык сарганізаванне ў 2008 Беларускага дня стала доказам даспявання абодвух бакоў, так польскага, як і беларускага.

Прысутнасць беларускіх канцэртаў у іншых вялікіх гарадах Польшчы цешыць не менш. Вельмі актыўная на гэтым фоне з'яўляецца Варшава, але таксама Кракаў не ўяўляе сабе жыцця без мілагучнай беларускай мовы. Торунь, Познань, зразумела, і Беласток адкрываюць для сябе беларускія гурты. Не так лёгка музыкам з Беларусі трапіць і на вялікія фестывалі ва ўсходняй частцы Еўропы. Цяжкія былі змаганні за ўдзельніцтва ў фестывалі „Усадьба джаз", які праходзіць ужо пару гадоў пад Масквой. Многія з беларускіх выканаўцаў марылі, каб трапіць на фестываль „Koktebel Jazz Festival". І вось у гэтым годзе ў час маляўнічага фэсту ля берага Чорнага мора ўдзельнікі пачуюць ажно чатырох беларускіх выканаўцаў. Праўда, планавалася цэлая ноч з беларускай музыкай, але нават такая доза беларускіх гукаў напэўна задаволіць усіх патрабавальных слухачоў. Свой джазавы бок творчасці з 10 па 13 верасня ў Актэбелі будуць прэзентаваць „Тройца", „Серебряная Свадьба", „CherryVata" ды „Акана". Ад пару гадоў ужо мне марыцца паслухаць джазу пры захадзе сонца над Чорным морам... А якія ў Вас музычныя мары? Пішыце на мой мэйлевы адрас, а я буду раскрываць Вам музычныя таямніцы і падказваць, як гэтыя мары здзяйсніць:)

i_basovka@o2.pl

Міра ЛУКША

Егер з Елянкі

Ехаў егер Елісей
у Елянку на камісію.
Ехаў бы яшчэ хутчэй,
лісапета ж высела.
Лісапету вон пад ель!
Во ж казала Ева:
„На такую каніцель,
палічыўшы дрэвы,
пешшу лепш ісці праз лес,
у еднасці з натурай.

Зараз бы на ровар лез!
Мо на аўтафуру?!"
„Енчыш, Еўка, мне ж пара
палічыць аленяў,
у камісіі спісаць
елкі і бярвенні..."
Есці ўзяў яечню, хлеб,
малака бутэльку...
А тут раптам! — чэп-чарэп! —
Лезе рысь на бэльку

ў леснічовачцы старой,
дзе сеў, каб пагрэцца...
Дзыг! — дзе тутака адбой:
рысь ў торбе грабецца!
А алень, каза і лось
рагочуць на славу:
Елісей, яшчэ прынось
на падкормку страву!

Польска-беларуская крыжаванка № 35

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў, дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 30:

Смак, пірог, сказ, лаза, музыка, гук, палатка, ну, русы, ха, мыш. Спеў, пух, слуга, казуля, пазыка, лізак, тры, аркуш, пах, Ас, агарода.

Узнагароды, запісную кніжку, выйграў, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава.



Тэатр для людзей

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Тэатр АЗ. Першы злева арганізатар фестывалю Дарыюш Скібінскі

Кожны з нас мае свае ўлюбёныя бездарожжы, такія ўхабістыя дарогі, хаця кепскія, але свае. Адны падаюцца ў раёны забытых бездарожжаў недзе там пры беларускай мяжы, вандруюць з цячэннем Свіслачы ці назад. Частка з нас вандруе бездарожжамі Белавежскай пушчы, тудою, дзе турысты паяўляюцца не надта часта. Кожнаму належыцца кусок свайго „вэртэпу". Зусім новыя бездарожжы жыхарам Падляшша паказалі у мінулы ўік-энд сябры таварыства „Паштоўка" — людзі „са свету", якія сваё ўтульнае месца знайшлі якраз у вёсцы Палічна. „Паштоўка" з 2004 года прыносіць з сабою весткі са свету тэатра, музыкі, мастацтва, але ўпершыню вырашыла падзяліцца гэтым са сваімі суседзямі з іншых вёсак і гарадкоў.

Памежны фестываль

— Я быў у Кляшчэлях і Белавежы, а сёння чакаю таго, што будзе ў Гайнаўцы, — гаворыць Норберт, адзін з валанцёраў. — У час першых двух дзён фестывалю людзі паказалі, што з тэатрам можна добра гуляць, што патрабуюць і такой уцехі, а гэты фестываль можа адкрыць вароты для альтэрнатыўных мастакоў Падляшша. Думаю, што фальклорныя фэсты некаторым ужо пераеліся, а тут проста новая прапанова.

— А як можна стаць валанцёрам такога фестывалю?

— Хтось пазваніў да кагосьці, той да свайго сябра і такім чынам мая сяброўка запрасіла мяне да супрацоўніцтва, а я не адмовіўся. Дзякуючы гэтаму змог я нават стаць статыстам у парадзе „Свабоднага тэатра" з Беларусі.

Першы Міжнародны фестываль тэатраў „Вэртэп" прайшоў у трох мясцовасцях: Кляшчэлях, Белавежы і Гайнаўцы. Пасля поўдня фэст адкрылі стацыянарныя тэатры, але пасля ўсе выходзілі са сцэны на вуліцу. Кожнага фестывальнага дня, увечары, жыхары Кляшчэль, Белавежы і Гайнаўкі маглі стаць часткай вялікага спектакля-парада. Маладыя людзі, якія прадстаўляюць беларускі незалежны тэатр, прывезлі з сабой касцюмы ды „свабодны" спектакль. Дзіўныя постаці на хадулях, з'явы, гукі бубнаў і вогненнае, натуральнае святло пасярэдзіне ночы. Акцёры не карыстаюцца ніякай канкрэтнай мовай, большасць складаюць жэсты, пантаміма і таямнічыя крыкі.

— Нашым дзецям напачатак было крыху страшнавата, бо і ўжо цёмна, а тут такія маскі і крыкі, але цяпер ужо з радасцю крочым разам з гэтым парадам, — кажуць гайнаўскія бацькі.

— „Малефіцыюм" гэта спектакль прыстасаваны да вуліцы, — кажуць акцёры „Свабоднага тэатра", — гэта такая форма блізкая звычайным людзям, але мы можам таксама іграць як у тэатры, увасабляць розныя постаці і, зразумела, даваць радасць.

— Мы, апрача польскіх тэатраў, запрасілі на фестываль таксама і групы з Беларусі, — кажа Дарыюш Скібінскі, арганізатар фестывалю ды яго мастацкі кіраўнік. — Гэта міжнародны фестываль, таму з намі тут „самая блізкая целу кашуля" — прадстаўнікі самай блізкай Беларусі, але ў будучым на Беласточчыне будуць прэзентавацца тэатры з Украіны, Літвы ды іншых краін. Мусім раскруціцца. Дарэчы, сёлета толькі што месяц раней падпісалі мы дамову на фінансаванне, тады і не было шанцаў прывезці тут усіх, каго хацелася.

Ігры ды гульні

Тэатр гэта від мастацтва, які некаторым можа здацца вельмі адлеглым, нейкім салонным. Але гарадскія пляцы ці амфітэатры Гайнаўкі, Кляшчэль ці Белавежы вельмі далёкія ад мяккіх, камфортных салонаў.

— Тут ёсць нешта для дзяцей, для дарослых, патрабавальных ды нават змораных нудой, — падкрэсліваюць аднагалосна арганізатары, а гайнаўскі стараста познім вечарам падтаквае:

— Я сёння яшчэ не нудзіўся.

Пачынаўся якраз канцэрт групы „Срэбнае вяселле" („Серебряная свадьба"). Гэта другі прадстаўнік беларускага боку, але дачыненне з тэатрам у іх крыху іншае.

— Света, наша вакалістка, з'яўляецца рэжысёрам у лялечным тэатры, але мы перш за ўсё іграем музыку, — тлумачыць Аляксандр Багданаў, які займаецца прамоцыяй гурту. — Гэта такі мікс жанраў, крыху славянскі, крыху французскі, але людзі вельмі цёпла нас успрымаюць. Аднак штораз часцей зараз нас запрашаюць на тэатральныя мерапрыемствы, бо мы і асабліва апрануты — Света ўвесь час нешта вымае з валізкі і атрымліваецца такі міні-спектакль.

— Мы чулі песні на рускай і на французскай мовах, на беларускай у вас ёсць рэпертуар?

— Зараз у нас дзве песні, узніклі дзякуючы спецыяльным праектам, але, думаю, можам імі ганарыцца, дарэчы, зашмат не выступаем у самой Беларусі. Там нават і цяжка ладзіць канцэрты. Затое ездзім у туры па Расеі, Польшчы, Нямеччыне ды іншых шматлікіх краінах.

„Срэбнае вяселле" выступіла толькі перад жыхарамі Гайнаўкі, якія ў вельмі душным памяшканні Музея і асяродка беларускай культуры амаль у ста працэнтах вытрымалі. Але канцэрт гэта не самае важнае як магло б здавацца.

— Якое вуха! — ледзь гаворачы захапляюцца малышы.

— Мама, глянь, паехаў нос! А рука якая!

Пачынаецца парад пачуццяў. На чале майстар-дырыжор у фраку вядзе парад мясцовых жыхароў і вялікіх, даслоўна вялікіх, людскіх пачуццяў.

— А зараз затанцуюць перад вамі вочы! — абвяшчаюцца чарговыя атракцыёны.

— У Белавежы ўчора ў парадзе маршыравала каля чатырохсот асоб, — шэпча адзін з удзельнікаў. Факт, Белавежа і Кляшчэлі мелі больш шчасця, лепшае надвор'е, цёплае, сонечнае, радаснае.

— У Белавежы да спектакляў далучаліся турысты, — тлумачыць Уля Дамброўская, спец па медыях і рэкламе фестывалю, а ў прыватнасці сяброўка са школьных часоў адной з арганізатарак. — Затое кляшчэлеўскі бурмістр паслаў аўтобус па вёсках, каб сабраць публіку. Казаў мне, што апошні раз у Кляшчэлях тэатр глядзелі сорак гадоў таму. Такая сантыментальная вандроўка ў мінуўшчыну.

У Гайнаўцы паху мінулага не было чуваць, затое быў неспакой ды радасць ад новага. Старэйшая жанчына ў сінім касцюме з захапленнем глядзела спектакль для дзяцей, таму пайшла на другі. Але другі быў зусім сучасны, хаця ў праграме прадбачаны дзецям. Шмат галасоў у час яго трывання паўтарала: „Гэта хіба для старэйшых дзяцей", „Гэта можа і неканешне для дзяцей". Але дзеці глядзелі, падсмейваліся, здзіўляліся і баяліся, паказвалі ўсе эмоцыі. Для таго і ёсць тэатр. Жанчына ў сінім касцюме, на жаль, не чакала ўжо чарговай прапановы. Засталіся затое шматлікія сем'і. Большасць з іх вандравала за тэатрамі і з тэатрамі да канца.

Прывучаць да тэатра

— А тут трэба плаціць? — пытае крыху прысаромлена жанчына з малышом, прышпіленым да штаноў.

— Не, не — з усмешкай запрашае ў расстаўленую пасярэдзіне гайнаўскага амфітэатра юрту Уля Дамброўская, — заходзьце і сядайце, пакуль яшчэ ёсць свабодныя месцы.

У юрце адбываюцца спектаклі для наймалодшых. Тут такая асаблівая атмасфера, шчыры смех дзяцей і радасць іхніх бацькоў ды дзядоў, якія таксама прыйшлі пазнаёміцца з тэатрам.

— Мы задумалі спектаклі для дзяцей у рамках фестывалю, бо з тэатрам трэба знаёміцца з дзяцінства, — кажа арганізатар „Вэртэпу" Дарыюш Скібінскі. — Дваццаць гадоў займаюся тэатрам і ведаю, што месца для тэатра ёсць усюды. Праўда, рэакцыі бываюць розныя, бо людзі ў малых мясцовасцях з тэатрам не маюць зашмат дачынення. Не абазначае гэта, што трэба баяцца, людзей да тэатра проста трэба прывучаць, але для гэтага патрэба проста часу.

У час парада пачуццяў

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі...

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

На шчасце гэта здарылася пяць хвілін да ад'езду аўтобуса. Калі я сядзела ля бюста-помніка Жыгімонту II Аўгусту і нюхала скошаную атаву ў парку, як з-пад зямлі з'явіўся местачковец з перавязанай рукой:

— Ці не з медычных службаў панечка будзеце? — спытаў ён неяк заклапочана мяне ці не магу зрабіць яму перавязку.

Я, вядома, была ўражанна даверам і прапановай. Паколькі ад нешчасліўца пахла трохдзённым запоем, я адсуналася на бяспечную адлегласць і хочаш не хочаш выслухала яго нараканні на медычныя службы, якія майго субяседніка спісалі „на страты", бо паставілі два супярэчныя дыягназы. Адны раілі настаўляць пераламаную руку, другія — пакінуць яе ў спакоі, каб сама па сабе зраслася. І што атрымалася ад розных пунктаў гледжання?

— Адна мэнка і страх!

Гэтае, на першы погляд звычайнае пытанне-нараканне, тут, у здранцвелай ад старасці і хвароб Ялоўцы прагучэла як сакрэтны лозунг паўстанца 1863-1864 гадоў.

Я сама спазнала падобныя *мэнкі*, калі вандравала слядамі Кастуся Каліноўскага. Цікавасць да гэтай гістарычнай асобы тут, на яго радзіме, роўная нулю. Мне нават прыемна было гутарыць з ігнарантамі. Іх эмоцыі, хоць і адмоўныя, сведчылі пра зацікаўленне асобай, таму гутаркі пра медычныя службы мелі таксама сваё значэнне. Тут трэба дадаць, што раней я начыталася пра ўдзел лекараў і аптэкараў у Студзеньскім паўстанні. Аказваецца, на адной Гродзеншчыне ў канспірацыі прымала ўдзел больш за 50 медыкаў. Сам гродзенскі губернатар даносіў М. М. Мураўёву, што большая частка агентаў рэвалюцыйнага камітэта гэта лекары і медычныя працаўнікі, якія па характары працы мелі магчымасць свабодна перамяшчацца з месца на месца і такім чынам скрываць факт дзейнасці ў тайнай рэвалюцыйнай арганізацыі.

Знаёмства з біяграфіямі паасобных медыкаў-канспіратараў прывяло мяне ў яшчэ большае здзіўленне. Аказалася, што большасць з іх закончыла медычныя факультэты Маскоўскага ўніверсітэта.

* * *

Адкуль такое раптоўнае ў мяне зацікаўленне Каліноўскім? Нядаўна ў мае рукі трапіў гродзенскі краязнаўчы сшытак з архіўнымі матэрыяламі пра Кастуся Каліноўскага. На наступны дзень я села ў аўтобус і паехала ў Ялоўку. Паводле звестак, там пахавана Вераніка Каліноўская з дому Рыбінская. Маці будучага рэвалюцыянера памерла ў час родаў, калі ў сям'і мела з'явіцца дванаццатае па ліку дзіця. Хатняя гісторыя, тая сапраўдная, па дакументах, пасадзіла мяне ў крэсла. Яна здалася мне намнога больш трагічнай і складанай, чым усе літаратурныя і мастацкія біяграфіі Каліноўскага (У. Караткевіч, *Каласы пад сярпом тваім*). З першага сужонства Сямёна з Веранікай памерлі ўсе 12 дзяцей; адны ў маленстве, іншыя ў маладым узросце. Апошні з іх, як не дзіўна, Вікенцій-Кастусь закончыў жыццё на 26 годзе на шыбеніцы. Яшчэ нядаўна складана было вызначыць месца яго спачынку. Паводле апошніх звестак, целы Каліноўскага і 13 паўстанцаў спачываюць у брацкай магіле на Гары Гедыміна ў Вільні.

На здаровы розум, мой пошук магілы маці, сясцёр і братоў рэвалюцыянера не павінен быць складаным. Паколькі Вікенція-Канстанціна хрысцілі 6 лютага 1838 года ў рымска-каталіцкім парафіяльным касцёле ў Ялоўцы, магілы маці і прынамсі часткі сям'і павінны знаходзіцца там жа.

Таму першыя крокі я скіравала да ксяндза на плябанію. Паколькі святара яшчэ не было дома, я завяла гутарку з жанчынай, якая на ровары заехала на старанна дагледжаны ксяндзоўскі панадворак.

— Я не тутэйшая, — адказала яна з ходу; магілы Каліноўскіх прапанавала шукаць на праваслаўным могільніку: — Tam Kalinouskich jak psów, — кінула яна і параіла пачакаць ксяндза. Мая субяседніца многія гады працавала настаўніцай у Мастаўлянах і Зубрах.

— У Мастаўлянах была школа імя Кастуся Каліноўскага, — цягнула я.

— Coś takiego faktycznie było, — пачула я ў адказ.

Касцёл у Ялоўцы

(працяг будзе)

Біблія і філатэлія

Наказваю вам:
любіце адзін аднаго.
(Яна 15:17)

„Кніга кніг", „Кніга жыцця" — так узвышана называюць Біблію. Для мільёнаў людзей Біблія была і застаецца крыніцай векавечных ісцін і мудрасці. Яна вучыць дабру і любові, перасцерагае ад нядобрых намераў і ўчынкаў.

Біблія поўнасцю ці часткова перакладзена на 2167 моў. Першая ў свеце друкаваная кніга — „Гутэнбергава Біблія" (1452-1455 гг.). Біблія была і першай друкаванай кнігай ва ўсходніх славян. А пераклаў яе на родную беларускую мову і надрукаваў, пачынаючы з 1517 года, наш вялікі суайчыннік, родам з Полацка, Францыск Скарына. Ля Нацыянальнай бібліятэкі ў сталіцы нашай Радзімы горадзе Мінску стаіць у задуме Скарына, трымаючы ў руках Кнігу, з якой ён прыйшоў да кожнага з нас.

Як па перакладах, так і па тыражы, Біблія сярод іншых кніг не мае сабе роўных. Таму Біблія аказвала і аказвае велізарны ўплыў на чалавечую гісторыю, культуру і мастацтва. Біблейныя матывы можна распазнаць у творах знакамітых мастакоў

і скульптараў, паэтаў і пісьменнікаў, творах, сабраных у знакамітых музеях, галерэях і бібліятэках усяго свету. Біблія аказала вялікі ўплыў на мову, якой размаўляем, на музычную творчасць. Мы жывем у свеце, які ў значнай ступені стаў упарадкаваны праз біблейную культуру.

Зробім спробу паказаць дзеі вызвалення чалавецтва праз паштовыя выданні. Марка, уведзеная да штодзённага ўжывання ў 19 ст., гэта доказ выканання паштовай аплаты. Разам з тым наклееная на пісьмо мініяцюра, якая разам з пісьмом і яго зместам пераадольвае граніцы моў і культур, злучае людзей і народы.

Пакажам з дапамогай паштовых марак доўгія дзеі збаўлення, якія папярэдзілі нараджэнне, жыццё, дзейнасць, смерць і паўстанне з мёртвых Ісуса Хрыста. А гэта таму, каб не толькі разгледзець мініяцюрныя малюнкі, але як мага больш даведацца аб тым, што яны паказваюць. Толькі тады марка вучыць, забаўляе і выхоўвае.

Стварэнне свету

З хваляваннем возьмем у рукі Кнігу кніг — Біблію і адкрыем першую старонку. Стары запавет — дагавор паміж Богам і Яго народам. Бог стварыў увесь сусвет, але запавет заключыў толькі з Ізраілем. Таму Стары запавет — гэта гісторыя народа Ізраіля і яго адносін з Богам. Таму большая частка кніг Старога запавету напісана на старажытнай яўрэйскай мове. Першая кніга Старога запавету — „Быццё":

„На пачатку стварыў Бог неба і зямлю. А зямля была нябачная і пустая і цемра над безданню, і Дух Божы лунаў над вадою. І сказаў Бог: хай будзе святло. І сталася святло. І ўбачыў Бог святло, што яно добра, і аддзяліў Бог святло ад цемры. І назваў Бог святло днём, а цемру ноччу. І быў вечар, і была раніца: дзень адзін" (Быццё 1:3-5).

Гэтаму першаму дню, ад якога ўсё пачалося, прысвечана марка пошты Ватыкана, выдадзеная ў 1974 годзе. Малюнак на марцы нагадвае мне казачны дом, унутры якога пануе святло. Уверсе маркі надрукаваны на італьянскай мове словы: „Хай будзе святло".

Шэсць дзён Бог ствараў свет, а на сёмы дзень „спачыў ад усіх дзеяў Сваіх" (Быццё 2:3). Кожны дзень стварэння свету адлюстраваны на шасці марках Ізраіля, выдадзеных у 1965 годзе. Мастак А. Гальдэрон у стылізаваным выглядзе адлюстроўвае падзеі кожнага дня.

Пад кожнай маркай знаходзіцца так званы прывесак. На прывесках на яўрэйскай і французскай мовах зроблены надпісы:

— дзень першы — стварэнне святла і цемры;

— дзень другі — стварэнне цвердзі, якая раздзяляе неба і зямлю;

— дзень трэці — стварэнне сушы, мора і раслін;

— дзень чацвёрты — стварэнне сонца, месяца і зорак;

— дзень пяты — стварэнне істот водных і птушак;

— дзень шосты — стварэнне жывёл дзікіх і дамашніх і чалавека.

Зусім іначай адлюстроўвае чацвёрты дзень стварэння свету геніяльны італьянскі скульптар, жывапісец, архітэктар, паэт, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў Адраджэння Мікеланджэла (1475-1564) на фрэсцы Сіксцінскай капэлы ў Ватыкане.

Марка, надрукаваная поштай Індыі ў 1975 годзе, так як і марка пошты Ватыкана з 1994 года, не могуць перадаць усяго духоўнага зместу і прыгажосці фрэскі, але заахвочваюць убачыць яе, каб уразіцца ейнай прыгажосцю і зразумець задумку аўтара перадаць змест выразу з Бібліі: „І ўбачыў Бог, што гэта добра" (Быццё 1:18).

Лявон КАРПОВІЧ

Грунвальд

На партале Spadchyna.org устаноўлены новы сайт Грунвальд. Сайт прысвечаны знакамітай падзеі нашай славутай гісторыі — 600-годдзю бітвы аб'яднаных дружын ВКЛ і Кароны Польскай з крыжакамі. У матэрыялах сайта размешчаны некалькі папак.

Першая папка змяшчае „Зварот сяброў клуба „Спадчына" да Савета Міністраў, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры, Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, творчых саюзаў, палітычных партый і грамадскасці краіны". На яго ўжо прыйшлі адказы дзяржаўных устаноў аб падтрымцы юбілейнага года адпаведнымі мерапрыемствамі. Прафесар Анатоль Грыцкевіч узначаліў створаны аргкамітэт па святкаванню Грунвальдскай бітвы.

У наступнай папцы пад назвай „Анатоль Грыцкевіч" змешчаны артыкул аўтара „Грунвальдская бітва 1410 — ліквідацыя пагрозы незалежнасці ВКЛ", у якой распавядаецца пра падзеі бітвы.

На сайце змешчаны таксама дзве папкі „Галерэя 1" і „Галерэя 2". У першай — каляровыя ілюстрацыі з польскага выдання кнігі „Album Grunwaldzki" аўтараў Анджэя Кляйна, Анджэя Надольскага і Анджэя Навакоўскага. Яны перадаюць поўнае ўражанне бітвы з дапамогаю карцін Яна Матэйкі, Зыгмунта Развадоўскага і Тадэуша Попеля. Апошнія мастакі сярод многіх эпізодаў адлюстравалі сцэны з удзелам войскаў ВКЛ, панараму і інтэр'еры замка Мальбарк, галоўнага ўмацавання крыжакоў. У другой прыкладаецца галерэя карцін беларускіх мастакоў і тэракотавыя медалі з выявамі герояў Грунвальда, якія знаходзяцца ў Старадарожскім нацыянальна-мастацкім музеі Анатоля Белага. Жыгімонт Карыбутавіч, Вітаўт, Ягайла, першы на Беларусі помнік Героям Грунвальда, фотаздымкі адкрыцця помніка з удзелам клуба „Вялікае Княства", кіраўніком якога з'яўляецца Арына Вячорка — усе гэтыя адметныя і знакавыя ілюстрацыі прадстаўляюць нашу сучасную і мінулую гісторыю.

Папка „Medieval II total war" з'яўляецца дакладнай копіяй у дзве з паловай хвіліны анімацыйнай стужкі фірмы „SEGA". Адлюстраваны падзеі бітвы з выдатным паказам яе асобных момантаў і 64 панарамныя здымкі знятыя на рэальным месцы Грунвальдскай бітвы.

Папка „Кнігі" змяшчае тэксты і ілюстрацыі з кніг і артыкулаў Аляксандра Краўцэвіча, Канстанціна Тарасава, Вітаўта Чаропкі, Станіслава Суднікa, прысвечаных падзеям Грунвальдскай бітвы. Адзначым, што С. Суднік зрабіў дзевяць карт, на якіх раскладваюцца ўсе моманты бітвы. Кнігі даюць поўнае ўражанне аб удзеле беларусаў у бітве і іх ролі ў перамозе. Іншыя крыніцы не раскрываюць ролі літвінаў падчас бітвы.

І, нарэшце, завяршаюць гэты сайт музычныя і літаратурныя набыткі нашых сучаснікаў, а таксама даецца нотны варыянт песні „Багародзіца", з якой беларусы ішлі на бітву. Адзначым, што літаратура і музыка ствараюць адпаведную ментальнасць нашага народа аб Грунвальдскай перамозе.

Роля Грунвальдскай бітвы яшчэ да канца не асэнсавана ў гістарычнай памяці народа, дзяржаўных СМІ і ўлады. Неабходна заўважыць, што амаль звыш палову тысячагоддзя тэрыторыя Беларусі не падвяргалася нашэсцю нямецкіх войскаў. Карыстальнікі могуць пачэрпнуць для сябе гістарычную, мастацкую, музычную і літаратурную глыбіню 600-гадовай даўнасці. Спадзяемся, што сайт будзе спрыяць натхненню нашым літаратарам, кампазітарам і мастакам на стварэнне найбольш грунтоўных твораў прысвечаных Грунвальдскай перамозе.

Пятро РУСАЎ
гісторык, краязнавец

Як казаў калісьці правадыр сусветнага пралетарыяту — „з усіх мастацтваў, для нас найважнейшым ёсць кіно". Калі згаджацца з гэтым меркаваннем, то найважнейшай справай ёсць усё, што тычыцца кінематаграфіі. Дзесьці гэта мае рацыю, калі зважаць на зацікаўленнасць простага люду жыццём кіназорак, абмеркаванню найпапулярнейшых кінафільмаў, баўленнем часу перад тэле альбо кінаэкранам.

Праўда, кіно не толькі забаўляе. Яно спакваля служыць сродкам выхавання і засваення гледачом тых ці іншых нормаў паводзін, поглядаў, і, канешне, моўных асаблівасцей. Беларуская кінематаграфія ў гэтым плане сур'ёзна адстае. „Оскараў" беларусы не заваёўваюць. Разам з тым, гэта зусім не нагода адлучаць іх ад набыткаў сусветна прызнаных фільмаў. Пэўна з гэтай прычыны існуе ў Беларусі такое творчае згуртаванне як „Дзіўноты й памароцтвы", што агучвае па-беларуску разнастайныя кіна- і мультыплікацыйныя фільмы.

Сайт згуртавання месціцца ў інтэрнэце па адрасе www.bydjp.org. Ягоны выгляд чамусьці нагадвае палічку, дзе ляжаць дыскі з награнымі фільмамі. Магчыма гэта таму, што на першай старонцы ідзе не нейкая прэзентацыя партала альбо ўласна згуртавання, а невялікія анатацыі да перакладзеных на беларускую мову фільмаў. Каб нешта даведацца пра „Дзіўноты й памароцтвы" як арганізацыю, трэба паглядзець на левы бок выяўлення, дзе знаходзяцца выйсці да іншых рубрык сайта.

Найбольш вартая ў дачыненні да азнаямлення з DJP™, як скарочана называюць сваю арганізацыю яе сябры, ёсць старонка „Медыі пра нас". У невялікай прадмове перад гіперспасылкамі да сайтаў медыяў, якія калісьці закраналі тэму дзейнасці „Дзіўнотаў і памароцтваў", стваральнікі беларускамоўных версій фільмаў просяць не перайначваць назву іхняга згуртавання. „Нас, безумоўна, цешыць сам факт увагі прэсы й іншых мэдыяў да нашае дзейнасьці, — хваляцца яны, — але даволі забаўна назіраць, як з кожным новым артыкулам ці рэпартажам чарговае выданьне пачынае „скланяць" назву згуртаваньня, так бы мовіць, „на ўласны капыл" — раз-пораз сустракаюцца то „Дзівосы...", то „Дзівоцтвы...", то яшчэ якое журналісцкае вынаходніцтва... Таму ласкава просім надалей быць крыху больш уважлівымі: назва суполкі творчае згуртаваньне „Дзіўноты й памароцтвы", альбо tvorčaje zhurtavańnie „Dziúnoty j pamarocty" лацінкаю. Для скароту на сайце мы часьцяком мянуемся DJP-team, альбо DJP™, але тое ўжо нашае свойскае абазначэньне, папросту каб было зручней".

Калі зноў вярнуцца да пераліку рубрык сайта, то зацікаўленаму ў праглядзе беларускамоўных версій будзе цікава даведацца, якім чынам можна набыць гэтыя дыскі для сябе. Тут мусіць дапамагчы рубрыка „Дзе набыць", у якой падрабязна апісваюцца пункты продажу. Праўда, тым аматарам беларускамоўнага кіно, што жывуць па-за Мінскам, але ў межах Беларусі, спадручней будзе скарыстацца інтэрнэтам дзеля паштовага набыцця фільма, які зацікавіць. Што рабіць у даным выпадку беларускай дыяспары, якая аб'ектыўна мае недахоп у беларускамоўных версіях сусветна папулярных фільмаў, на сайце не паведамляецца.

На шчасце, уладальнікі сайта не цураюцца інтэрнэт-карыстальнікаў, якія могуць быць іхнімі патэнцыйнымі кліентамі. На сайце ёсць старонка „Зваротная сувязь", праз якую можна даслаць ім свае заўвагі, прапановы і пытанні.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Трыумф і фіяска

На неверагодным кантрасце прайшлі для беларускіх прадстаўнікоў два чэмпіянаты свету — па веславанні на байдарках і каноэ і па лёгкай атлетыцы. Весляры дасягнулі сапраўднага трыумфу — ажно сем залатых узнагарод, чаго наша суверэнная гісторыя яшчэ не ведала. А вось лёгкаатлеты ўпершыню не занеслі ў летапіс славы аніводнай узнагароды. Больш таго, у бальшыні відаў беларускія падданыя каралевы спорту пацярпелі сапраўднае фіяска.

На такі фантастычны поспех, якога дасягнулі нашы майстры вёслаў у канадыйскім Дартмуры, мала хто спадзяваўся. Мяркуйце самі. Дзяніс Гаража першынствааў у каноэ-адзіночцы на дыстанцыі 500 метраў. Ён жа ў складзе чацвёркі на кіламетровым адрэзку ўзяў золата разам з Дзмітрыем Вайцішкіным, Аляксандрам Ваўчэцкім і Дзмітрыем Рабчанкам. Двух апошніх у экіпажы з Андрэем і Аляксандрам Багдановічамі выйгралі фінальны заезд чацвёрак на адлегласці 200 метраў. Такая ж дыстанцыя плюс кіламетровая прынеслі два першыя месцы экіпажу байдаркі-чацвёркі, у якім выступалі Раман Петрушэнка, Вадзім Махнеў, Аляксей Абалмасаў і Артур Літвінчук. Алімпійскія чэмпіёны Петрушэнка і Махнеў яшчэ двойчы ўзышлі на верхнюю прыступку п'едэстала пасля парных заездаў на 500 і 200 метраў. Калі заблыталіся, перачытайце гэты абзац яшчэ раз і пасмакуйце выдатныя дасягненні. Нашы мужчыны сталі лепшымі па медальным ураджаі, а ў агульным заліку Беларусь стала мацнейшай разам з Германіяй. Плён прынесла найперш комплексная праца галоўнага трэнера каманды Уладзіміра Шантаровіча. Не абышлося, праўда, і без горкага прысмаку. Так, алімпійскія чэмпіёны браты Багдановічы на сваіх дыстанцыях 1000 і 500 метраў сталі толькі сёмымі і дзевятымі.

Далей пра берлінскія расчараванні. Беларуская каманда прыехала на сусветны форум у значна абноўленым і памаладзеўшым складзе. Спецыялісты, аднак, не без падстаў прагназавалі адзін-два медалі. Прыкладам, кідальнік молата Юрый Шаюноў меў другі вынік у свеце, штурхальніца ядра Наталля Міхневіч — трэці паказчык сезона, абое былі пераможцамі і прызёрамі буйных турніраў. На практыцы чэмпіянату свету ўсё сталася куды сумней. Міхневіч у выніку заняла 4-е месца, што стала лепшым вынікам сярод усіх беларускіх удзельнікаў. Шаюноў праваліўся ўжо ў кваліфікацыі, нават не выйшаўшы ў фінальную стадыю. Хоць тут няўдачу можна спісаць на маладосць. Дзіўна, але кваліфікацыйны нарматыў не выканалі кідальніцы молата Аксана Мянькова (алімпійская чэмпіёнка Пекіна!) і Дар'я Пчэльнік, шматвопытныя кідальніцы дыска Ірына Ятчанка і Эліна Зверава. Апошнія дзве ўвогуле не зрабілі аніводнай заліковай спробы. У такіх гадах дамам даўно пара саступіць дарогу маладым, альбо выступаць належна, бо чэмпіянат свету — гэта не першынство двара, дзе можна рабіць што заўгодна. Зноў загадкава не выйшла на старт стометроўкі Юлія Несцярэнка. Добрых слоў заслугоўваюць бягун на 100 метраў з бар'ерамі Максім Лынша, які ўсталяваў асабістае дасягненне і выйшаў у паўфінал, кідальнік молата Павал Крывіцкі, які прайшоў у асноўную стадыю, а таксама штурхальнік ядра Павел Лыжын, паўтарыўшы свой лепшы вынік і заняўшы 6-е месца. У сваю сённяшнюю сілу выступілі дзесяціборац Андрэй Краўчанка (10-е месца) і „ядзершчык" Андрэй Міхневіч (7-е). Астатнія пераважна вучыліся і набіраліся каштоўнага досведу. Значны рэгрэс можна адзначыць у жаночых эстафетах. Абойма 4 па 100 метраў праваліласа, а каманду 4 па 400 Беларусь не здолела нават заявіць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Семяноўка

Фэст пад бярозамі

Як у мінулыя гады, так і сёлета, 9 жніўня пасля поўдня ў Семяноўцы (Гайнаўскі павет) адбыўся народны фэст. Перад мясцовай святліцай і пад бярозамі (яны давалі цень) сабралася многа людзей. Гэта адзіны такі фэст тут на працягу года. А да таго стаяла цёплае, сонечнае надвор'е.

А 16 гадзіне войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч прывітаў жыхароў Семяноўкі, Тарнопаля, Нараўкі і акалічных вёсак, а таксама тых, хто прыехаў паслухаць канцэрт з Гайнаўкі і з Міхалоўскай гміны ды мастацкія калектывы. Зычыў прыемна правесці святочны час (была якраз нядзеля і парафіяльнае свята — Панцеляймона).

Пасля поўдня ў гэтай ціхай і зялёнай вёсцы стала асабліва гаманліва і шумна. А колькі аўтамашын стаяла ў два шэрагі паабапал Школьнай вуліцы! Фэст — добрая нагода сустрэцца са знаёмымі і сваякамі, а мужчынам паглядзець на прыгожых дзяўчат.

І пачаўся канцэрт, які вяла Кася Бяляўская — інструктар Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы. На сцэне выступілі эстрадныя і фальклорныя калектывы „Спадчына" і „Раднікі" з Пружан (Беларусь), „Obraz Kontrolny" з Гайнаўкі, „Каласкі", „Сказка" і „Зорка" з Беластока, „Рэчанька" з Козлікаў, „Omen" з Міхалова і Падляшская капэла з салістам Маркам Скамароўскім з Сямятыч.

„Спадчына" выклікала фурор сваімі самымі прыгожымі народнымі касцюмамі і танцамі: кадрыллю, полькай на прысюды, пружанскімі гульнямі, рускімі перапляскамі ды мяцеліцай.

„Раднікі" — гэта дзявочы песенны гурт з пяці асоб. Ён нядаўна на сцэне і ўпершыню выступаў па-за межамі Беларусі. У выкананні дзяўчат слухачы пачулі шмат прыгожых беларускіх песень пра Радзіму і жураўлёў, што на Палессе ляцяць, а таксама рускіх лірычных пра каханне. Яны то ўводзілі ў задуму, то зноў весялілі. І стала так светла і радасна на душы!

Затым Кася заказала выступ Марка Скамароўскага з капэлай (заваяваў ён другое месца як саліст на фестывалі „Беларуская песня-2009"). І вось паплылі песні адна за другой. Найперш беларуская „А ў полі вярба", а затым „Чырвона рута", „Смэрэка" і „Żurawie", апошняя на словы і музыку Язэпа Карпюка з Сямятыч. Слухаць яго можна гадзінамі! Марк з калегамі заваражылі публіку.

Спадабаліся выступленні моладзевых „Каласкоў" з Беластока ды жаночай групы „Рэчанька" з Козлікаў (Заблудаўская гміна) са славутымі спявачкамі Любай Гаўрылюк ды яе дачкой Алай Каменскай. Ала захапляльна, як кожны іншы раз, выканала свой шэдэўр „Даставай, Сцяпан, гармонік".

Пасля шматгадзіннага канцэрта час прыйшоў на танцы. Іграў гурт „Axel" з Нарвы. І так адшумеў народны фэст у Семяноўцы. Да сустрэчы праз год!

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Міша пра „Муху з Махнатага"

Бзыкае над ранкам
муха
над вухам,
Спаць не дасць.
Вазьмі яе
і не пляж.
Не гаворачы ўжо
пра рэпартаж,
якога сюжэт
гатовы меў
я ў галаве.
Яна няспынна
напралёт
свідруе той сюжэт
на рэпартаж
над ранкам
у Махнатым.
Сон, сюжэт
і рэпартаж прапалі
з прычыны
махнацкай мухі-бзыкухі.

М. К.

З чыгуначнай Чаромхі

Усё мяняецца

19 жніўня — традыцыйныя святкаванні на святой Гары Грабарка. Даўней Чаромху ў гэты дзень (і напярэдадні адвячоркам) штурмавалі сотні паломнікаў, якія падаваліся на святочную літургію з самых адлеглых мясцін Беласточчыны. Чыгунка пастаўляла дадатковыя цягнікі, паколькі гэтыя, па раскладу язды, не забіралі ўсіх падарожных.

Прадпрыемства рэгіянальнай перавозкі ў Беластоку сёлета арганізавала дадатковы цягнік з Беластока ў Сямятычы. З Чаромхі адпраўляўся ён у 8.17, але пасажыраў было няшмат. У асноўным ехала моладзь (старэйшыя, мабыць, пакарысталіся аўтамабільным транспартам). Сустракаў я гэты цягнік на зваротным праездзе ў Беласток а 10.15. Чатыры вагоны суперсучаснага рэйкавага аўтобуса „Жубр" амаль пуставалі. У Чаромсе апрача кандуктараў ніхто не выйшаў, ды і пасадку зрабіла ўсяго некалькі асоб. Чыгуначнае падарожжа на паломніцтва адыходзіць у забыццё. Уступае месца пешаходным пілігрымкам. А такія ўсё больш „папулярныя" ў крузе маладых вернікаў Праваслаўнай царквы.

Чаромхаўскія вуліцы

Работы на Сасновай ідуць поўным хадам.

Стан палатна шматлікіх вуліц у пасёлку не найлепшай якасці. У большасці гравейкі разбітыя. Патрабуюць мадэрнізацыі. А на гэта абмежаваныя сродкі. Сёлета гміна занялася добраўпарадкаваннем вуліцы Сасновай, якая вядзе ў напрамку Мядзвежыкаў і Мілейчычаў, як і новага пасёлка. Наведаў я адрэзкі дарожных работ у сераду 19 жніўня. Работы ішлі поўным ходам. Як сказаў мне дарожны работнік, Сасновая яшчэ пры канцы жніўня атрымае новыя тратуары і асфальтавае палатно. Крыху пазней закончыцца мадэрнізацыя вуліц на новым пасёлку. Каб гэтыя інвестыцыі не былі апошнімі!

Віншуем!!!

У 12 нумары „Нівы" ад 22 сакавіка друкаваўся мой допіс „Слаўся Чарамшына", у якім я заахвочваў чытачоў падтрымаць гурт „Чарамшына" ў плебісцыце інтэрнаўтаў на найлепшую фолькавую кружэлку 2009 года. З прыемнасцю магу паведаміць, што маем ужо афіцыйныя вынікі. Наш гурт заваяваў II месца ў плебісцыце за дыск „Uśmiechnij się", і I месца за найцікавейшую вокладку дыска. За чарамхоўскі гурт прагаласавала 1145 інтэрнаўтаў, а пераможца атрымаў 1499 галасоў. У плебісцыце ўдзельнічала 70 гуртоў. Заваяванае II месца — гэта гонар не толькі чаромхаўскім самадзейнікам, але і ўсяму Падляшскаму ваяводству на ніве культурнай дзейнасці.

Віншуем!

Уладзімір СІДАРУК

Што хачу, тое і галашу

Страх — сцяна на шляху самапазнання. Трэба абысці ці прабіць яе. Стрымлівайце ўсе эмоцыі, акрамя эмоцый радасці. Тады спазнаеце, што такое любоў блізкіх і навучыцеся самі любіць свет і сябе.

Кніга — гэта саюз усяго існага, гэта вечна жывая вада чалавецтва, якая не дае знікнуць, адысці ў нябыт таму ці іншаму пакаленню. Аснова бяссмерця чалавецтва — кніга.

Газета „Ніва" — здаўна аўтарытэтнае выданне. Яна глядзіць наперад зорка, пашану зведала спаўна. „Ніва" — нязгасная зорка.

Д. Д.

Адгаданка



1. афрыканскае возера на граніцы Заіра і Руанды, 2. механізм для пад'ёму і перамяшчэння грузаў, 3. побач прозвішча, 4. „важны" плод хваёвых раслін, 5. дом за горадам для летняга адпачынку, 6. жаночая істота, якая мае жыць у вадзе або жыце, 7. расліна сямейства перцавых з пякучым смакам і моцным пахам пладоў, 8. лявоніха або полька, 9. хабараўская рака, 10. Готфрыд Вільгельм, нямецкі філосаф і матэматык (1646-1716), 11. Аляксей, беларускі паэт (1920-1981), 12. памяшканне ў бібліятэцы для чытання, 13. садовае дрэва з сакавітымі цёмна-чырвонымі пладамі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — японская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 30 нумара

Буран, Ван, вецер, вол, вушы, дата, Лоеў, сена, спеў, сын, цаца, язда.

Рашэнне: **Слова падобнае снараду — вылецеўшы з вуснаў, не вяртаецца.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Ідуць і едуць да Бога

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Вернікі, што ідуць і едуць у святыя месцы, каб пакаяцца ў сваіх грахах, прасіць у Бога прабачэння і памаліцца за сваіх сямейнікаў, сваякоў і іншых блізкіх асоб верацъ, што праз гэта прыбліжаюцца да Усявышняга. Нашы людзі лічаць, што асаблівае перамяненне іх жыцця адбываецца ў час свята Праабражэння Гасподняга, калі штогод мы нанова перажываем падзеі з Фаворскай гары. Найбольш паломнікаў надалей збіраецца ў час праабражэнскіх святкаванняў разам са сваімі святарамі і епіскапамі на Грабарцы. Аднак Грабарка не ёсць ужо, як было яшчэ гадоў дзесяць назад, адзіным месцам масавага прытоку вернікаў, што ідуць і едуць, каб пакланіцца Праабражэнню Гасподняму. Іншай горкай, на якой апошнімі гадамі сталі масава збірацца вернікі на супольныя праабражэнскія святкаванні, вяртаючыся да традыцыяў, з'яўляецца Дзмітрыеўская горка побач Сакоў. Многа людзей прыходзіць у дзень Праабражэння Гасподняга таксама ў іншыя цэрквы, збудаваныя ў гонар гэтага свята, напрыклад, на могілках у Кленіках і Новым Беразове, а праабражэнскія богаслужэнні адбываюцца амаль ува ўсіх прыходах.

— Я памятаю, як людзі хадзілі ад нас у мінулым у паломніцтвы на святую Дзмітрыеўскую горку, — успамінаў настаяцель Мужчынскага манастыра ў Саках і манастырскага прыхода, архімандрыт Варсанофій, які родам з Гарадоцкай зямлі. — Пасля апошняй вайны паломніцтвы былі забаронены, а ўлада рознымі спосабамі старалася адцягнуць маладых людзей ад малітваў у цэрквах. Гэта ёй удавалася толькі часткова. Хаця не было супольных пешаходных паломніцтваў, як раней, дык людзі індывідуальна ехалі на фурманках, веласіпедах і ішлі пяшком, каб пакланіцца Госпаду на святых месцах, напрыклад, на Грабарцы ці на Крыначцы, дзе былі крыніцы са святой аздараўляльнай вадой. Не пайшла ў забыццё таксама Дзмітрыеўская горка, на якой увесь час збіраліся праваслаўныя людзі, а нават прыходзілі і каталікі, каб пакланіцца Дзмітрыеўскай іконе. Гэтая горка, прыкрытая сасновым лесам, мураванымі, жалезнымі і драўлянымі крыжамі, што знаходзяцца на старадаўніх сакоўскіх могілках і новымі драўлянымі крыжамі, якія прынеслі з сабой паломнікі, напамінае горку на Грабарцы. Знізу, на паляне, быў збудаваны, а пасля прыкрыты дахам калодзеж, які таксама крыху падобны на грабарскі калодзеж. Непадалёк ёсць і невялічкі ручаёк, які дае пачатак рэчцы Белай. Мясцовыя людзі лічаць, што з Божага блаславлення адбылося адкрыццё мужчынскага манастыра непадалёк ад дзмітрыеўскага месца, а пасля і жаночага ў Залешанах, і зараз праваслаўныя вернікі, так як і перад вайной, масава збіраюцца на малітвы на святой горцы. Хаця зараз асвячэнне вады адбываецца на горцы, то гадоў дзесяць таму вада асвячалася яшчэ ў прыгожа прыкрытым калодзежы.

На праабражэнскіх святкаваннях на Дзмітрыеўскай горцы з кожным годам збіраецца штораз больш людзей

— Высахла вада і таму перасталі асвячаць яе ў нашым калодзежы, — сказаў адзін з сакоўскіх прыхаджан.

У час праабражэнскага і дзмітрыеўскага святкаванняў паляна побач калодзежа перамяняецца ў вялікую стаянку для машын. Так было і ў час летніх святкаванняў у гэтым годзе, калі паявілася на ёй мноства аўтамабіляў з Гайнаўскага, Бельскага і Беластоцкага паветаў, бо праваслаўныя вернікі з сямятыцкай зямлі падаліся ў асноўным на Грабарку. Побач аўтамабіляў можна было ўбачыць таксама і трактары, на якіх прыехалі старэйшыя жыхары навакольных сёл, як і рабілі ад часу, калі праўдзівых коней памянялі на механічныя. Хаця яшчэ вялікія пешаходныя паломніцтвы абмінаюць Сакоўскі прыход і падаюцца перад Праабражэннем Гасподнім на Грабарку, то меншыя пешаходныя групы ў дзень святкавання ідуць ужо з навакольных вёсак на Дзмітрыеўскую горку.

— Раней праабражэнскія святкаванні побач Сакоў былі камернымі (яшчэ гадоў дзесяць назад — А.М.), а апошнімі гадамі і тут збіраецца ўжо мноства людзей, — заявіў жыхар Беластока. У гэтым годзе, так як і ў мінулых, цяжка было прабіцца ў сярэдзіну царквы, дзе людзі стаялі прыціснутыя адзін каля аднаго. Аднак вернікі слухалі богаслужбы і маліліся стоячы таксама вакол храма, побач магіл з даўнімі і сучаснымі крыжамі і пад дрэвамі, якія былі аховай ад сонца ў час цёплага надвор'я. Каля званіцы прадаваліся свечкі і прымаліся запіскі для малітваў, а толькі вакол царкоўнай агароджы разбілі свае латкі прадаўцы цукерак і цацак.

— Гэтага нельга інакш назваць, як цудам, што людзі зноў сталі масава збірацца на гэтай горцы. Я вельмі рады калі бачу, што вернікі стараюцца падысці пад чытаемае Евангелле, а пасля пацалаваць яго. Па вашай веры даецца вам Божае блаславленне, а што яно даецца, няма сумненняў, — сказаў кляшчэлеўскі благачынны, мітрафорны протаіерэй Мікалай Келбашэўскі, што ўзначальваў галоўную літургію ў дзень святкавання (першая начная літургія служылася пасля поўначы і прымалі ў ёй удзел таксама многія святары, паломнікі з больш аддаленых месцаў і тыя, хто мусіў днём ісці на працу).

У час багаслужбы вернікі паволі падыходзілі да асвячонай вады, пілі яе і набіралі ваду ў бутэлькі, каб завезці дамоў сваім сямейнікам і для пазнейшага карыстання. Людзі верацъ, што вада прывезеная з сакоўскай горкі, як з летніх, так і з дзмітрыеўскіх святкаванняў, дапамагае духоўна адрадзіцца і лечыць хворыя месцы. У час багаслужбаў 18 і 19 жніўня шматлікія вернікі спавядаліся са сваіх грахоў і прымалі прычасце. У пропаведзі айцец Мікалай Келбашэўскі звяртаў таксама ўвагу на небяспекі, адцягваючыя ў жыцці людзей ад Бога і заклікаў да малітваў. Не пакідаць праваслаўя і трымацца свайго веравызнання заклікаў у канцы багаслужбы настаяцель Мужчынскага манастыра ў Саках, архімандрыт Варсанофій. Зараз у гэтым манастыры моліцца і працуе чатырох іераманахаў, адзін дыякан і некалькі паслушнікаў. Дапамагаюць ім, як харчаваннем, так і сваёй працай прыхаджане з Сакоў, Тапароў і многія прыезджыя, што супольна з жыхарамі манастыра рыхтаваліся да летніх святкаванняў. Штодзень людзі прывозяць у манастыр агародніну, фрукты, бульбу, малако, яйкі. Прыхаджане дапамагалі таксама ў час рамонтаў школьнага будынка, пераўтворанага ў манастырскае жыллё. З восені да вясны гэтага года на Дзмітрыеўскай царкве быў выкананы новы дах, бо стары моцна падгніў, і амаль увесь храм быў прыкрыты гонтай. Зараз прыгожа бачацца яны разам з бляшанымі купаламі і адмаляванымі звонку сценамі. Была адрамантавана і даўняя званіца, што знаходзіцца асобна ад царквы. Прадбачваюцца таксама рамонты ўнутры храма.

29.08 — 04.09

(22.03. — 20.04.) 28 — 31.08. не кіруйся эмоцыямі, бо могуць быць праблемы ў пары. Калі хочаш у ёй штосьці змяніць, спачатку гэта абдумай. Пачатак верасня нервовы, будзеш моцна злавацца; не шукай звады. Дзве першыя дэкады верасня будзеш жыць перш за ўсё каханнем!

(21.04. — 21.05.) Да 31.08. пераканаеш кожнага да сваёй рацыі. Шмат радасці прынясе табе сям'я. 1 — 5.09. будзь вельмі асцярожны ў падарожжы. Перад табою верасень змен і неспадзевак.

(22.05. — 22.06.) 1 — 5.09. крытыкуючы іншых вострымі словамі можаш падвяргнуцца гневу; баявітыя настроі. Жыццё круціцца вакол сям'і. Грошы зарабляюцца лёгка. Каханая асоба будзе задзіўляць цябе на кожным кроку

(23.06. — 23.07.) Агромная сіла пераконвання. Добра з хатнімі. У прафесійных справах усё пойдзе гладка. Слухай інтуіцыі, у што ангажавацца. Бегай і схадзі ў спортзалу.

(24.07. — 23.08.) Будзеш неспакойным духам. Пазнаёмішся з асобай, якая будзе адпавядаць табе ў кожным плане. У некаторых прафесійных спрэчках спешка можа аказацца найлепшым дарадчыкам.

(24.08. — 23.09.) Пільнуйся асабліва 28.08. Урэшце будзеш займацца сваімі справамі. Перад табой гарачыя дні і надта цікавыя ночы. У цудоўны спосаб пачне прыбываць табе грошай

(24.09. — 23.10.) Варта выбрацца ў адпачынак. Шчырыя размовы з партнёрам. Не пераймайся тым, на што не маеш уплыву. Час радасці, добрай пазіцыі на працы. Дома не заўжды вясёла, бо будзеш перш за ўсё выканаўцам загадаў.

(24.10. — 22.11.) Змены ў пачуццёвым жыцці. Або касмічна закахаешся, або... адкахаешся. Не занядбоўвай сну. У першай дэкадзе верасня справы спыняцца ў мёртвым пункце; мала запалу, перашкоды папсуюць настрой. Схільнасць да запаленняў і гарачкі, але хутка справішся з хваробамі.

(23.11. — 22.12.) Добра ў хатніх і суседскіх справах, падарожжа без праблем. У пачуццях пастаў на аўтэнтычнасць і ў нічым не прытварайся. Не абяцай сабе зашмат. Глядзі на ўсё рэальна.

(23.12. — 20.01.) Верасень поўны ўражанняў. Новае каханне труднае; падумай, ці справішся з кімсьці з такім пакручастым характарам! Чакаюць цябе рашэнні, якія моцна паўплываюць на тваё жыццё. Аперацыя ўдасца.

(21.01. — 19.02.) Будзеш пабуджаны да дзеяння і зрэалізуеш штосьці вельмі важнае. Спакой — можна сказаць, што працяг канікул. У пары крыху застою, затое на працы трэба будзе выказацца спрытам; шыкуецца завіруха! Шмат занятка ў і высілку.

(20.02. — 21.03.) На пачатку месяца мала энергіі, можаш паламацца ці кантузіцца. Але паявяцца новыя нагоды і магчымасці, а цяперашнія мэты могуць аказацца малаважнымі. 4 верасня — нечаканыя падзеі і шчаслівыя выпадкі. Можа паявіцца хтосьці, каго ты даўно забыў. У канкурэнцыі трымайся свайго рытму.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва

ПРА ВАНДРОЎКІ

Крыху Аўгустоўшчыны

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

З беластоцкага аўтобуса ў Ліпшчаны сыходжу на прыпынку Ракавічы. На шашы відны сляды нядаўніх праліўных дажджоў: на асфальце ляжаць абшырныя жвіравыя наносы. Шаша такая сабе, калісь спалучала Аўгустаў з Гроднам. Рух тут мізэрны, аднак у іншых палітычных умовах магла б яна быць магістраллю паміж згаданым Гроднам і балтыйскімі партамі, паміж Беларуссю і морам. Дарога на гэтым напрамку вядомая ўжо з 14 стагоддзя, калі злучала Гродна з Райградам; спярша называлі яе Нямецкім трактам, пазней Каралявецкім... Цяперашняя дарога была вызначана ў канцы 16 стагоддзя.

Кіруюся ў бок Рыгалаўкі, да дарогі, што вядзе ў гэтую вёску з боку Далінчан. Першая сядзіба пры гэтай дарозе абведзена саліднай жалезна-каменнай агароджай, у якую ўбудавана шыкарная паўкупальная каплічка з каменя...

Лісток Элцкай дыяцэзіі „Мартырыя" паведамляе, што ў парафіі Рыгалаўка, якая ахоплівае ўсходнюю частку Ліпскай гміны, жывуць набожныя людзі, каля паўтары тысячы душ, галоўным чынам пажылых, бо маладыя з'язджаюць адсюль, часта ў замежжа. Працуе тут 31 ружанцавы кружок, а для прыслужвання тут пяцьдзесят міністрантаў!.. Варта пацікавіцца, з чаго гэтая набожнасць вырасла, як фармавалася ў мінулым. Дзеля таго трэба прасачыць гісторыю гэтай зямлі ў тых яе межах, у якіх набірала яна свой цяперашні канфесійны воблік. Значыць, варта заглянуць у мінулае Аўгустоўскага павета ў межах Сувальскай губерні, калі ўсходняя мяжа згаданага павета падыходзіла ўпрытык да Гродна і Нёмана. Значыць, трэба на гэты момант празрыста глянуць на цяперашнюю дзяржаўную граніцу...

З 1358 года гэтая тэрыторыя ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага, распасціралася там Перстунская пушча. Пасля зыходу з яе яцвягаў сталі яе засяляць пасяленцы з усходу, пра што сведчаць даўнія назвы тамашніх мясцовасцей, напрыклад, Краснае, Пералессе, Дарагушын, Трысцені. Каля паўтысячы гадоў таму паўсталі там вёскі Рыгалаўка, Сёлка, Ліпшчаны, Ячнікі, Дулькоўшчына, Далінчаны — этымалогія гэтых назваў вызначае і плямёны, якія іх засноўвалі, і дазваляе меркаваць пра іх тадышнюю канфесію. У пачатку 16 стагоддзя, піша Васіль Татарчук з Гродна, праваслаўная Спаская царква з трыма служыцелямі была ў Балі (сёння Зарэчанка — пяць кіламетраў на паўночны захад ад Гродна). У 1585 годзе была ўжо царква ў Ліпску, а ў наступным стагоддзі — у Рыгалаўцы. У чарговым, 18 стагоддзі, былі ўзведзены ўніяцкія цэрквы ў Лабне (у дзесяці кіламетрах на захад ад Гродна), Галынцы (кіламетр ад граніцы насупраць Капчан); у 1780 годзе была ўзведзена мураваная царква ў Сапоцкіне. Каля 1810 года на тэрыторыі Аўгустоўскага павета былі ўніяцкія прыходы ў Балі, Галынцы, Ліпску, Лабне, Перстуні (каля пятнаццаці кіламетраў на паўночны захад ад Гродна), Рыгалаўцы, Сапоцкіне і Аўгустове. У складзе Аўгустоўскага дэканата былі яшчэ парафіі з Высокамазавецка і Гадышэва.

Былая школа ў Рыгалаўцы

Паколькі Сувальская губерня была ў межах Каралеўства, дык пераводу у праваслаўе тамашніх уніятаў, што засялялі Аўгустоўскі павет, адбыўся ў 1875 годзе — 36 гадоў пасля такога ж пераводу іх суседзяў з-па-за Каралеўства, напрыклад з тадышніх Сакольскага, Беластоцкага, Бельскага і Драгічынскага паветаў, якія ў 1808-1842 гадах складалі Беластоцкую акругу Расійскай імперыі. І гэты перавод адбыўся не так гладка, як той у 1839 годзе. У 1875 годзе ўніяты Каралеўства рэзка супрацівіліся канфесійнаму новаўвядзенню, асабліва на Паўднёвым Падляшшы. Галоўнай прычынай супраціву праваслаўю было значнае збліжэнне ўніяцкага абраду да каталіцкага, напрыклад, ва ўніяцкіх святынях ужываліся арганы, званочкі, існавалі бакавыя алтары, песні спявалі па-польску, гаварылі ружанец, святары-ўніяты апраналіся як лацінскія ксяндзы, чыталі літургічныя тэксты толькі па-польску і на гэтай мове гаварылі казанні. І, здаецца мне, у іншую канфесію не пераводзілі іх такія іерархі, як у 1839 і 1596 гадах.

Пасля ліквідацыі ўніі ў губернях, якія былі непасрэдна ўключаны ў склад Расіі, трэба было спадзявацца такога ж ходу і ў Каралеўстве, — сцвярджае Андрэй Вашкевіч з Гродна. Таму многія ўніяты сталі прымаць каталіцтва, хаця ў 1829 годзе выйшаў царскі ўказ забараняючы гэтакія неафіцтвы. Прыклад: у 1839 годзе большасць уніятаў у Ліпскай парафіі вырашыла перайсці ў рыма-каталіцтва, каб такім чынам пазбегнуць прымусовага пераводу іх у праваслаўе, аднак касцельныя ўлады пабаяліся рэпрэсій і адмовіліся задаволіць іх просьбу. Усё ж такі агітацыя за каталіцтвам адбывалася паспяхова, бо калі ў 1820 годзе ўніятаў у павеце было прыблізна ўдвая больш чым каталікоў, то ўжо пяцьдзесят гадоў пазней стала больш каталікоў. Яшчэ ў 1875 годзе з уніяцтва ў каталіцтва ўдалося перайсці звыш паўтары тысячы асобам у Аўгустоўскім павеце...

27 красавіка 1875 года ў Балі адбылося далучэнне амаль дзесяці тысяч уніятаў Аўгустоўскага павета да праваслаўя. У Ліпску ўніяты, якія не хацелі прыняць праваслаўя, зачыніліся ў сваёй царкве і не пускалі ў яе царскіх чыноўнікаў і папа, але такое супраціўленне было хутка зламана. Аднак больш істотны быў пасіўны супраціў, калі былыя ўніяты ўсяляк спрабавалі прыняць каталіцтва ці хаця хрысціць у касцёле сваіх дзяцей, але за гэтым пільна цікавала царская адміністрацыя і такое не заўсёды ўдавалася. Усё ж такі шыла вылазіла з мяшка ў іншым месцы: у Аўгустоўскім павеце да неймаверных памераў, 15 працэнтаў — у некалькі разоў больш, чым у іншых паветах, вырасла колькасць незаконна народжаных дзяцей; маладажоны, што не хацелі вянчацца ў царкве, патайком вянчаліся ў касцёле і іх сужонствы лічыліся незаконнымі!..

Расійскае праваслаўе ўспрымалася тут як нешта чужое, нават варожае, за ўнію трымаліся як за веру дзядоў. Таму многія зрабілі ўсё магчымае, каб застацца пад папскай уладай, калі не ў якасці ўніятаў, то прынамсі ў якасці каталікоў. Як пісаў Адам Станкевіч, „быўшым уніятам Беларусам імпанавала лацінскае каталіцтва й тым, што было ўцісканае й што гэта была вера іх дзядоў".

Варта прасачыць гісторыю некаторых уніяцкіх і праваслаўных храмаў даўняй Аўгустоўшчыны. Мура-

Касцёл у Рыгалаўцы

ваны храм у Перстуні быў пабудаваны ў 1848 годзе як уніяцкая царква, у 1875-1915 гг. належаў праваслаўным, а з пачатку 1920-х гг. з'яўляецца касцёлам. Царква ў Лабне была ўзведзена ў 1882 годзе ўжо як праваслаўная на месцы старой уніяцкай; цяпер гэта таксама каталіцкі касцёл. Падобна выглядае гісторыя царквы ў Галынцы, пабудаванай у 1891 годзе на месцы драўлянага ўніяцкага храма 1714 года, у якой у 1919 годзе стаў служыць імшу каталіцкі святар, а ў 1922 годзе была там заснавана каталіцкая парафія. Старую драўляную царкву ў Балі мясцовыя жыхары разабралі і ў 1937 годзе ўзвялі на яе месцы касцёл. У Сапоцкіне каменная царква пасля 1918 года не дзейнічала і выкарыстоўвалася сялянамі як сховішча для збожжа, а з пачатку 1950 гг. як склад тытуню. У 1970 годзе па загадзе мясцовых улад храм знеслі; ад яго ацалела толькі абмуроўка, якая знаходзіцца на тэрыторыі ўзведзенага на царкоўным месцы дзіцячага садка. Касцёл у Сапоцкіне, які быў тут пабудаваны ўжо ў 1612 годзе, у 1890-1916 гг. выконваў ролю праваслаўнага жаночага манастыра. У Рыгалаўцы новая мураваная царква, на месца старой драўлянай, была ўзведзена ў 1902 годзе, а ў 1919 годзе стала касцёлам; крыху памяняўся і яе вонкавы выгляд, калі быў знесены купал і зменены дах. У Ліпску ў рынку ў 1880 годзе была ўзведзена мураваная царква побач старой драўлянай. У першых гадах 20 стагоддзя лік праваслаўных у Ліпску рэзка ўпаў і тамашняя царква апусцела ў 1908 годзе; была яна раскідана ў 1930-х гадах, а на месцы колішняга ўніяцкага драўлянага храма ў 1922 годзе быў насыпаны Курган свабоды. З 1857 года, калі згарэў драўляны, касцёла не было ў Ліпску да 1914 года, калі быў здадзены ў карыстанне новы, мураваны, які там па сённяшні дзень.

17 красавіка 1905 года цар Мікалай II падпісаў указ аб рэлігійнай талерантнасці. Паводле ўказа, праваслаўе заставалася пануючай рэлігіяй у Імперыі, але з яго цяпер можна было законна перайсці ў іншае веравызнанне. У 1905-1909 гг. на тэрыторыі Каралеўства Польскага каталіцтва прыняло 230 тысяч былых праваслаўных. Па афіцыйных звестках расійскага ўрада, за перыяд 1905-1913 гг. у каталіцтва з праваслаўя ў Аўгустоўскім павеце перайшло звыш шаснаццаці тысяч чалавек.

Колькасць праваслаўных імкліва скарачалася, а ўлады маглі толькі строга сачыць за выкананнем усіх неабходных фармальнасцей пры пераходзе ў іншую веру, — паведамляе Андрэй Вашкевіч. Вясной 1912 года вікарый рыма-каталіцкага касцёла ў Ліпску Юзэф Монтвіл ахрысціў дачку бацькоў, што перайшлі з праваслаўя ў каталіцтва, але не паспелі гэта адпаведна аформіць. 27-гадовы Юзэф быў пазбаўлены права займаць пасады ў парафіях на тэрыторыі Расійскай Імперыі. Няшчасны ксёндз вымушаны быў пакінуць краіну, падаючыся ў Амерыку. Апынуўся ён на легендарным цяпер „Тытаніку", які пацярпеў крушэнне 14 красавіка таго ж года... Цела ксяндза прывезлі ў Вільню, дзе з усімі ўрачыстасцямі пахавалі.

Я тут западозру, што рэлігійныя падзеі, якія адбываліся на нашай непрыкметнай Аўгустоўшчыне ў царскую эпоху, паўплывалі на развіццё мастацтва ў сусветным маштабе — падабаецца каму гэта ці не. Магчыма, што я ў нечым памыляюся, але маё меркаванне грунтуецца на прычынна-выніковых сувязях падзей. Менавіта, у царскі час Аўгустоўшчына адмаўлялася ад праваслаўя, але праваслаўе не хацела адмовіцца ад Аўгустоўшчыны, разлічвала на яе рэканкісту... У разгар першай сусветнай вайны царскія ньюсмейкеры распусцілі па расійскай інфармацыйнай прасторы вестку, што адна з расійскіх часцей мела каля Аўгустова відзеж Багародзіцы, якая на левай руцэ трымала Збавіцеля, а працягнутай правай паказвала на захад; пасля гэтага расійскае войска мела перайсці ў наступленне ў паказаным напрамку, завершанае яго вялікай перамогай. Аднак у аператыўных зводках з фронту згадкі пра такі цуд не было. Гэты сюжэт меў даць і даў стымул для напісання адноснай іконы, якая атрымала назву Аўгустоўскай іконы Багародзіцы, і паўсюднага ў Расіі, масавага яе тыражавання...

Я ў гэтым месцы асмелюся западазраваць далей, што масава растыражаваная выява працягнутай рукі з відзежу на нашай ціхай Беласточчыне неўзабаве стала лейтматывам новага, у нейкім сэнсе баталістычнага, напрамку ў мастацтве, якое ахапіла аж шасціну свету. Хаця ў час бальшавіцкага іканаборства іконы выйшлі з публічнай прасторы, аднак сама ідэя працягнутай рукі, паказваючай напрамак да перамогі, прыжылася. У другую сусветную вайну з'явілася постаць „Родина-мать", таксама з працягнутай рукой, толькі больш энергічна, а ў перыяд класавай вайны маскоўскія ленінаводы вывелі адмысловую манументальную жывапісна-скульптурную пародзу вялікага правадыра з яшчэ больш размашыста працягнутай рукой, якая таксама атрымала шырокае тыражаванне на прасторах шостай часткі сушы зямнога шара...

За савецкі час Аўгустоўскую ікону прызабылі, але ў маі мінулага года патрыярх Алексій II блаславіў унясенне ў каляндар яе праслаўляння — была выбрана дата 14 верасня. Адзін з кандакоў з акафіста гэтай іконе вяшчае: „Во дни лютой брани с полчищами германскими, поднявшимися от западных предел славянское знамя растоптать, корону русскую сокрушить и народы Православные поработить, явилась в ночном небе в лесу Августовском русским ратникам Царица Небесная, на ополчение против иноверных призывающая".

Паралельна з пераходам у каталіцтва, жыхары Аўгустоўшчыны сталі дэкларавацъ польскую нацыянальнасць, каб быць як найдалей ад „славянского знамени". Паводле перапісу 1897 года ў Аўгустоўскім павеце жыло 25 712 беларусаў (32,46% ад агульнай колькасці насельніцтва) з іх 11 196 праваслаўных і 14 503 каталікі. Амаль усе беларусы жылі ва ўсходніх гмінах павета. Варта аднак звярнуць увагу на той факт, што

Аўгустоўская ікона

перапісчыкі вызначалі нацыянальнасць не паводле саманазвы, а па моўным прынцыпе. А так як насельніцтва ўсходняй Аўгустоўшчыны карысталася беларускай мовай, то і было запісана беларусамі, хаця ўжо тады, мабыць, адносіла сябе да ліку палякаў. Паказаў гэта перапіс 1921 года, калі колькасць беларусаў у цэлым павеце склала ўсяго 92 чалавекі з агульнай колькасці 62 384 жыхароў, што было ў 288 разоў (!) менш, чым у 1897 годзе... Гэта высновы Андрэя Вашкевіча, а Марцін Ліцьвінка піша так пра сённяшняе наваколле Ліпска: „najlepszym przykładem dialogu kulturowego jest istniejący jeszcze bilingwizm, czyli obok języka polskiego, gwara wschodniosłowiańska — tzw. język prosty, który można jeszcze usłyszeć na wsi, lecz który w wyniku rozwoju cywilizacyjnego powoli zanika, postrzegany przez młodych ludzi jako element zacofania". Мне вельмі свярбіць пяро, каб заўважыць, што і нашы „маладыя" самаўрадаўцы, якім ой як не хочацца прыняць дапаможнай мовы, той „gwary wschodniosłowiańskiej", вылеплены з такой самай гліны, што і незвычайнае насельніцтва Аўгустоўшчыны, а гэта яшчэ раз пацвярджае наша ўсходнеславянскае братэрства, шматкультурнае...

Пара такім чынам вярнуцца ў сённяшні дзень. Беласценны касцёл у Рыгалаўцы дамінуе над ваколіцай. Гэты храм сапраўды, як патрабуе царкоўная сімволіка, узвышаецца над наваколлем быццам карабель над морам. А наваколле выглядае вельмі прыстойна: сенажаці — у даліне Мядзведзіцы і Бобры — пакошаныя і прыбраныя, сена толькі дзе-нідзе ляжыць, а амаль усюды расце сакавітая атава. Палі акуратна засеяныя жытам ці аўсом, маладых лясоў амаль няма, ды і тыя малалікія каўтунчыкі звышдзесяцігадовыя; самасеяў не відаць. На пашах ідылічна пасвяцца статкі кароў.

Праўда, ёсць і засмучаючыя віды: побач жвіроўкі стаіць пакінутая сядзіба. А жвіроўка гэта жвір, каменьчыкі. Як жа нейкаму маладому чалавеку не спакусіцца, каб такі каменьчык падняць і пацэліць у шыбы незаселенай хаты. І гуляй там цяпер вецер, разгульвайся...

У Рыгалаўцы відаць вынікі нядаўніх атмасферных падзей. Вада ад ліўня вымыла абочыну асфальтоўкі і адкрыла пласты вулічнай гісторыі, колішнюю брукаванку. Пункт прыёму малака паказвае, што рух каля яго спыніўся некалькі гадоў раней. А сталася так таму, што пастарэлыя сяляне не займаюцца ўжо традыцыйнай вытворчасцю малака, якое трэба было вазіць менавіта ў тыя прыёмныя пункты. Цяпер у наваколлі большыя статкі кароў, якія даюць такую колькасць малака, што ўжо толькі ў цыстэрны і ў малочныя заводы.

Амаль насупраць закрытага малочнага пункта стаіць раскошная новая каплічка, вымураваная з чырвонай цэглы, абведзеная чырвонымі штыкецінамі, накрытая чырвонай бляхай. непадалёк стаіць і бетонны крыж з 1905 года ў жалезнай агароджы.

Сам касцёл бачыцца вельмі прыемна, бо і архітэктары, і будаўнікі яго дбайна аднесліся да сваёй місіі, каб Усявышняму аддзячыць тым сваім умельствам, якое ад Яго атрымалі. Магчыма, што храм выглядаў бы яшчэ больш імпазантна, калі б быў захаваны ў ім купал; як жа выглядалі б без купалаў Пятроўская базіліка ў Рыме ці Марыінская кафедра ў Фларэнцыі?.. Дарожка ў храм дбайна ўквечаная.

Не меншай увагі, чым сам касцёл, заслугоўвае парафіяльны парк побач. Тут вельмі дбайна скампанаваная флора: кветкі, кусцікі, гладка падстрыжаная траўка, пышныя каменныя вазоны. Мне, вось, здалося, што так мае выглядаць рай, што гэты парк з'яўляецца менавіта свайго роду прывабліваннем да ўзнёслага.

Крышку далей, наўскос ад райскага парку, будынак школы. Яе выгляд, а асабліва выгляд школьнага пляца, паказваюць, што заняткаў няма там ужо ад некалькіх гадоў. На акраіне школьнага ўчастка радок металічных гушкалак, якія зараслі буйной травой, акурат скошанай на сена.

На мяжы Рыгалаўкі і Сёлка стаіць чарговая шыкарная каплічка з фігурамі анёлаў на вуглавых слупах. Ад яе адыходзіць дарога ў бок парафіяльных могілак. Могілкам гэтым, магчыма, будзе за дзвесце гадоў, бо пра іх ёсць згадка з 1804 года. На іх стаіць драўляная капліца на каменным падмурку, пабудаваная, верагодна, каля паловы 19 стагоддзя.

Вёска Сёлка невялікая, але ў ёй працуе аж тры крамы! Дзеецца так таму, што навакольныя вёскі раскіданыя па хутарах, куды нявыгадна ездзіць мабільным магазінам, таму

Касцёл у Ліпску

На мяжы Буга

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

З аўтобуснага прыпынка ў Мельніку падаюся далей. За мною астаецца Гмінная ўправа і „Тапаліна", дзе ладзяцца галоўныя мельніцкія пленэрныя мерапрыемствы. І пачынаецца альховы лес, мінаю адну мураваную каплічку, пасля другую і, здавалася б, што Мельнік ужо астаўся за мною. Але за лесам паказваюцца чарговыя збудаванні — гэта мельніцкае Прадмесце. На скрыжаванні тамашніх вуліц заўважаю новабудаваную каплічку, якой дах і купал пакрыты яшчэ толлю. І падаюся ў вулічку, якая мае мяне вывесці на дарогу ў напрамку Вайкава.

Пакідаючы мясцовасць, заўважаю за сабою вялікі трохпавярховы будынак з арнаментаванымі вокнамі, які падаўся мне ні то млыном, ні то пансіянатам. Жанчына, якая выйшла на суседні агарод, расказала мне, што той будынак сапраўды быў млыном і пабудаваны быў недзе пры Гамулцы. Калі памёр ягоны будаўнік, сын пакойніка ўсталяваў там іншую майстэрню, але і той сын памёр у саракагадовым узросце і прыгожы будынак з таго часу пустуе. Унучкі млынара жывуць цяпер у Варшаве, час ад часу наведваюць драўляную хату свайго дзеда, але вялікі будынак, які мог бы выконваць ролю гатэля ў адпачынковым Мельніку, пакуль што пустуе.

Дарога з Мельніка ў Вайкаў пралягае праз пераважна сасновы лес пасляваеннага вываду. Чым бліжэй Вайкава, той лес маладзее і перад самой вёскай паказваюцца яшчэ не цярэбленыя сасонкі мо дзесяцігадовага ўзросту. Вайкаў зарастае лесам, толькі на адной палосцы свежа скошаная пожня — яшчэ нехта „спазніўся" з аблясеннем гэтага кавалка зямлі.

Вайкаў цяпер разбудоўваецца, старыя хаты абнаўляюцца, узводзяцца новыя. Гэтая з'ява для Вайкава не новая, пра пабудову новых хат у Вайкаве пісаў ужо сорак гадоў таму Мікола Гайдук у артыкуле з цыкла „Краязнаўчы слоўнік". І тыя новыя не адрываюцца сваім дызайнам ад традыцыйных, як гэта часта ў нашых мясцовасцях бывае, але гэта скромныя катэджы, накрытыя найчасцей традыцыйным двухпакатным дахам. У пачатку Вайкава, з боку Мельніка, стаіць каталіцкая філіяльная каплічка Мельніцкай парафіі, узведзеная там дзесяць гадоў таму і асвечаная 26 верасня 1999 года. У вёсцы стаіць толькі адна пакінутая хата, усе іншыя жывуць. Гаспадарчыя будынкі выконваюць у Вайкаве ролю апірышчаў для сушкі кастроў дроў. Большасць панадворкаў скошана мота- ці электракасілкамі. На некаторых участках, якія раней выконвалі б ролю прысядзібных агародаў, відаць пакосы ад сенакасілкі, якіх, як мне падалося, ніхто не збіраецца збіраць.

Пытаю пажылога вяскоўца, ці насупраць Вайкава ёсць пляжы. Цяпер няма, бо шмат вады ў Бугу, але калі вада ападае, тады паказваецца жоўты пясочак, на якім можна пазагараць. У пойме ракі растуць маляўнічыя вербы...

З Вайкава ў Сутна ціхая жвіроўка, па якой толькі час ад часу праедзе нейкая легкавушка. І пралягае гэтая жвіроўка ў самой пойме Буга, а гэта абазначае, што ў паўнаводдзе можа яна апынуцца пад вадою. Падыходзіць гэтая дарога амаль да самой вады. Можна з яе любавацца г.зв. Падляшскім прарывам Буга, якога воды, праціскаючыся заходняй акраінай Палескай нізіны, з якой галоўную масу вады адводзіць у Чорнае мора Прыпяць, прарываюцца паміж Бельскім і Сядлецкім узвышшамі і „ўцякаюць" у напрамку Балтыкі. А з другога боку дарогі таксама ёсць на чым спыніць зрок, бо сюды абрывам падыходзяць узгоркі згаданага Бельскага ўзвышша. Гэтыя абрывы ўсё падлягаюць эрозіі, якая абсыпае зямлю ад каранёў растучых там дрэў, якія — дрэвы гэтыя — можна аглядаць у поўны рост — з адкрытымі каранішчамі і каронамі. Гэтую ідылічную карціну можа сапсаваць прарыў агрэсіўнай цяперашняй цывілізацыі — насупраць мяне праехаў маладзён на матацыкле без глушыцеляў і ў гэтай прыроднай цішыні

крамы ў Сёлку не маюць вонкавай канкурэнцыі. Крыху збоку стаіць і будынак млына. Вёска, якая зараз называецца Siółko, трыццаць гадоў таму называлася яшчэ Siołko і таму цяпер былі прадбачаны кансультацыі наконт вяртання гістарычнай назвы; пра гэта даведаўся я, на жаль, пазней і не распытаў людзей пра іх меркаванне на гэты конт. Аднак і так можна з упэўненасцю меркаваць, што яго жыхары будуць за новай назвай. Справа тут не ў паланафільстве, але ў некаторай грамадскай пасіўнасці, якая на гэты час ахапіла тамашнія вёскі. Памёр, менавіта, адзін з гмінных радных і трэба было выбраць іншага на месца пакойніка. Аднак выбары ў акрузе, да якой належыць Сёлка, не адбыліся ў выніку адсутнасці ахвотных на гэтую пасаду. А яшчэ ў прадугледжаным законам тэрміне за гэтае месца змагалася аж семярых радных, і то даволі энергічна...

На ўзгорку за вёскай, побач шашы ў напрамку Ліпска, стаіць бетонны помнік у памяць пятнаццаці жыхароў Сёлка, расстраляных гітлераўцамі ўжо ў першы дзень вайны, 22 чэрвеня 1941 года. З першапачатковага надпісу „W HOŁDZIE / 15 MIESZKAŃCOM WSI SIÓŁKO / ROZSTRZELANYM PRZEZ / HITLEROWSKICH OKUPANTÓW / W DNIU 22 CZERWCA 1941 R. SIÓŁKO 1981 / RODACY" знікла каля трэці літар і складана меркаваць, ці сталася гэта ад уплыву часу, ці мо нехта захацеў зарабіць на латуневым металаломе.

Кіруюся на поўнач ад Сёлка, у напрамку Капчан. Справа, ва ўсходнім напрамку распасціраецца панарама даліны ракі Мядзведзіцы; праўда — цяпер гэта не рака, толькі постмеліярацыйны раўчак, паабапал якога разлеглыя сенажаці. Сена адтуль рупліва сабрана, а пра сёлетні клопат з яго ўборкай сведчаць чорныя

Інтэр'ер касцёла ў Ліпску

каляіны ад трактарных колаў, што асталіся ў гразкім грунце. І палі тут абрабляюцца рупліва, хаця відаць, што не ўсім гаспадарам удалося ўтрымацца на плаву цяперашняй гаспадарчай рэчаіснасці. Сям-там відаць апусцелыя сядзібы з нядаўна пабудаванымі будынкамі, зрэдчас відаць і не надта старыя аблагі. Мабыць, іх гаспадарам спадарожнічалі промахі ў выбары напрамку гаспадарання, або былі ў іх звычайныя слабасці характару... Зямля на ўсходзе Ліпскай гміны якасная, глебы чацвёртага класа складаюць звыш сарака працэнтаў ад усіх угоддзяў і найбольш іх у абсягу вёсак Ялова, Дулькоўшчына, Сёлка, Ячнікі, Капчаны, Далінчаны і горада Ліпск.

Даліну Мядзведзіцы закрывае ад усходу сцяна лесу — гэта дзяржаўная граніца з Беларуссю. Так выглядае шмат адрэзкаў польска-беларускага кардона, дзе з усходняга боку прадбачаная саветамі памежная амаль кіламетровая паласа зарасла лесам. А палякі абрабляюць зямлю ўпрытык з граніцай...

У Капчанах прыходзіцца мне памяняць раней прадбачаны маршрут, паколькі інтэрнэтавы расклад курсіравання аўтобусаў аказваецца быць багацейшым ад напісанага на аўтапрыпынку; заміж у Воўкуш кіруюся ў бок Ліпска.

Маю ўвагу прыцягвае капчанская вясковая святліца, якая, як інфармуе адмысловая шыльда, паўстала за сродкі з Пасляакцэсійнага фонду падтрымкі вясковых абшараў. Вывеска ў дзвярах установы інфармуе, што працуе яна чатыры разы ў тыдзень па чатыры гадзіны. Аднак кругом гэтага ачага культуры расце траўка, на якой не відаць вытаптаных слядоў прагных духоўнасці наведвальнікаў.

Праходжу побач Кур'янкі, адной з большых вёсак у наваколлі, якая ў міжваенны час была нават тытульнай сядзібай гміны. Відаць там шмат новых імпазантных будынкаў, а з боку шашы, што пралягае з Дулькоўшчыны ў Ліпск, напісаны на каменным крыжы верагодны дэвіз жыхароў гэтай — на вонкавы від багатай — вёскі: „O wy wszyscy, którzy idziecie przez drogę, obaczcie a przypatrzcie się: jeśli jest boleść jaka — boleść moja. 1908".

Ад згаданай шашы з Дулькоўшчыны ў Ліпск распасціраецца шырокі краявід прадаліны Бобры, якую некалі пакінуў там ледавік. Цяпер тыя ранейшыя поймы змеліяраваныя і дбайна добраўпарадкаваныя — няма там сухіх травастояў, якія відаць побач рэк на паўднёва-ўсходняй акраіне Беласточчыны. І шмат у тамашнім наваколлі статкаў кароў; відаць, што з даліны Бобры і Мядзведзіцы цячэ ў свет шырокая струя малака.

Перад Ліпскам апынаюся ў сітуацыі быццам з нейкага пасляваеннага фільма. Насупраць мяне ідзе мо пяцігадовы хлопчык, побач якога ляніва бяжыць амаль роўны з ім сабака. Параўняўшыся са мною дзіцяня пытае ці не бачыў я ягонага бацькі...

У Ліпск спяшаў я на аўтобус, які фігураваў у інтэрнэце, але давялося пачакаць на гадзіну больш... Пахадзіў я крыху па гэтым невялічкім горадзе туды-сюды. Вялікі — у маштабе Ліпска — трохпавярховы адміністрацыйна-гандлёвы геэсаўскі будынак цяпер поўнасцю пустуе; працуюць невялікія прыватныя крамы, рух у іх вельмі памяркоўны. Цэнтральны парк горада, на якім з 1880 да 1937 года стаяла мураваная царква, цяпер займае ўтульны парк. Перад будынкам школьнага комплексу, на месцы колішняй уніяцкай царквы, узвышаецца Курган свабоды, насыпаны ў 1922 годзе. Несумненнай візіткай Ліпска з'яўляецца касцёл, якога высокія шпілі відаць нават з адлеглага наваколля. Прывабна ён выглядае звонку, а яшчэ прыгажэй з сярэдзіны, дзе чырвона-белыя дугі прыводзяць асацыяцыі са славутай Мескітай у Кордаве, пабудаванай арабскімі канкістадорамі Андалузіі...

Як кругом нас ні глядзець — усюды шматкультурнасць.

Паром у Няміраве

пранёсся ён быццам нейкае акустычнае цунамі.

Сутна размясцілася за поймай Буга, каля паўкіламетра ад яго рэчышча. Перад школьным панадворкам прывітала мяне машынна-звалачная станцыя, дзе пакояцца нядаўнія тузы сельскагаспадарчай тэхнікі: ратацыйная касілка, раскідальнік гною, цыстэрна, кавалкі „цыклопа", кузавы грузавікоў...

Цікава выглядае каталіцкая капліца ў Сутне, філіяльная Няміраўскай парафіі. Капліца, па сваёй задуме, з'яўляецца помнікам шаснаццаці жыхарам Сутна, расстраляным гітлераўцамі ў першы дзень атакі на Савецкі Саюз, 22 чэрвеня 1941 года. Будавалася тая капліца ў два этапы: у 1951 годзе ўдалося ўзвесці каменную пячору, а ў пачатку 1990-х гадоў дабудаваць асноўны мураваны корпус храма, пакідаючы ранейшую пячору ў якасці прэсбітэрыя. А ў вайну было так, што ў Сутна ўварваліся немцы і хутка занялі вёску. Спыталі яны яшчэ жыхароў, ці не асталіся ў вёсцы рускія, і атрымалі адмоўны адказ. Аднак нейкі салдат быў прыхаваўся і выстраліў па немцах. І вось за такую „хлусню" гітлераўцы ўчынілі крывавую расправу над мясцовым мірным насельніцтвам.

У Сутне забудова яшчэ не занадта адарвалася ад традыцыйнай. Тут шмат хат старэйшага выгляду, ёсць большыя дамы геркаўскай моды, ёсць і шмат абабітых сайдынгам, але гэта не курортная вёска, як Вайкаў. Мо таму, што вёска аддаленая ад Буга, які, у дадатак, насупраць Сутна даволі непрыступны, з гразкім узбярэжжам.

У Сутне пражывае каля ста васьмідзесяцт душ, яшчэ пяцерых сялян займаюцца земляробствам. Яшчэ там большасць палёў вакол вёскі абрабляецца, толькі дзе-нідзе лапікі аблагоў. З боку Вайкава на пашы адзін статак кароў, з другога боку два статкі. Сенажаці амаль усе скошаны, сакавіта зеляніцца атава. Аднак крыху далей за вёскай паяўляюцца пасадкі, у тым ліку і маладыя, ды самасеі. Гэты наступ былой Мельніцкай пушчы аддзяліў ужо паласой лесу Сутна ад Нямірава.

Каля Нямірава яшчэ крыху палеткаў абрабляюць сяляне, але вялікага гаспадарання там не відаць. Участкі апрацоўваных палёў перамяжоўваюцца з аблесенымі; Няміраў быццам аддзяляецца ад вонкавага свету. Ды і сам выгляд мясцовасці паказвае на яе згортванне. Зараз там пражывае каля ста трыццаці душ. Шмат хат запушчаных, шмат атрымала модны цяпер выгляд з сайдынгам або каляровай шалёўкай. Пляц Вызвалення перад касцёлам выглядае вельмі сумна; пасаджаны на ім туі, аднак растуць яны неяк вяла ды і трава на тым пляцы сёлета не была кошана, хаця засілля пустазелля там няма. Можа там такая глеба, не надта ўраджайная, тыповая для Усходняй сцяны.

Заўважаю солтысаву шыльду і заходжу дахаты, пытаюся пра магчымасць пераправіцца на другі бераг Буга. Солтыс інфармуе мяне, што ён загадвае паромам, але не перавязе, бо замала ў Бугу вады, паром не пойдзе. Інфармуе, што калі мне трэба на другі бераг, то ён ахвотна мяне перавязе на лодцы, толькі мне трэба тую лодку пашукаць самому. На маё зацікаўленне, ці ёсць у Няміраве нейкія ўласнікі лодак, што самі маглі б мяне пераправіць на другі бераг, солтыс называе аднаго, інфармуючы, што жыве ён там, дзе другая ад яго *ułeczka.*

Іду я да таго чалавека, чыя хата перад другой вулачкай. Пытаю яго пра перавоз на другі бераг, але ён аднекваецца, што толькі солтыс мае дазвол вазіць людзей цераз раку. Праўда, па маім новым субяседніку відаць, што ён можа і рызыкнуў бы такое падарожжа, але пабойваецца, што нехта можа пра такое здарэнне ўдаць; я ж яму незнаёмы і невядома, ці ў мяне няма нейкай скрытай задумы. Рэкамендуе ён мне падацца ў Мельнік, там таксама паром і ў Мельніку напэўна перавязуць мяне за Буг.

Але ж мне нецікавае мельніцкае Забужжа, мяне цікавіць процілеглае акурат насупраць Нямірава Гнойна.

У Гнойне да 1945 года быў праваслаўны прыход, але калі пасля вайны яго прыхаджане эмігравалі ў Савецкі Саюз, пабудаваная ў 1875 годзе мураваная царква стала касцёлам. Вёска Гнойна згадваецца ў дакументах ужо ў пачатку XVI стагоддзя; у канцы таго ж стагоддзя была там царква. У 1633 годзе ў Гнойне была ўзведзена новая драўляная царква, а сто гадоў пазней, у 1734 годзе, чарговая драўляная. Гнаянскі прыход ахопліваў спярша праваслаўных і пазней уніятаў, што пражывалі на супрацьлеглым беразе Буга: у Нівіцах (цяперашнім Няміраве) і Вульцы (цяпер гэта лічаныя хаты між Няміравам і Мутной). Да таго ўсяго турправаднікі хваляць панарамы Буга, што ад Гнойна праз Стары Бубель (там таксама царкоўка), Стары Паўлаў (і там) да Янава-Падляшскага, дзе таксама багаты подых гісторыі — у Янаве была доўгі час сядзіба луцкіх біскупаў...

А Няміраў спярша называўся Нівіцамі, значыць на тым сутыкненні Мельніцкай пушчы з Бугам людзі займаліся не толькі ляснымі промысламі і рыбалоўствам, але вырошчвалі там, на тых — узворваных сохамі з запрэжанымі валамі — нівах-нівіцах, і залацістыя ўраджаі збажыны. У 1616 годзе падляшскі

Касцёл у Няміраве

кашталян Станіслаў Няміра афармляе Нівіцам гарадскую прывілею і мяняе іх назву на Няміраў, а ў 1620 годзе ўзводзіць там драўляны касцёл; да новай парафіі падключаюць і каталікоў з супрацьлеглага Гнойна. Няміраўскі касцёл згарэў у 1775 годзе, а на яго месцы ў 1790 годзе вырастае новы, мураваны, які стаіць і да сёння; у 1823 годзе была вакол яго вымуравана агароджа з брамай-званіцай.

Геаграфія прадвызначыла Няміраву і асаблівую гісторыю. На прасторы стагоддзяў Няміраў быў пагранічнай мясцовасцю. Ужо ў 1569 годзе побач Нямірава пайшла мяжа Брэсцкага і Падляшскага ваяводстваў, Літвы і Кароны; Няміраў апынуўся ў Кароне. Пасля 1795 года Няміраў апынаецца ў Прусіі, а побач мястэчка зыходзяцца граніцы трох дзяржаў: Прусіі, Аўстра-Венгрыі і Расіі. Пасля Венскага кангрэса Няміраў апынаецца ў межах Расійскай імперыі. У 1939-1941 гг. — з савецкага боку на мяжы з Германіяй, а з 1944 года з польскага боку на мяжы з Савецкім Саюзам... У жніўні 1915 года нямецкія войскі фарсіруюць Буг каля Нямірава і тое ж самае дзеецца ў чэрвені 1941 года...

У красавіку 1940 года жыхары Нямірава вымушаны былі высяліцца за пагранічную зону, на г.зв. Выган; на старым месцы астаецца толькі касцёл, куды ўваход забараняецца. Касцёл у Няміраве быў закрыты і ў 1866-1905 гадах. У першую сусветную вайну ў ім быў ваенны шпіталь. Ёсць у Няміраве вуліца Шпітальная, якая каля касцёла лагічна пераходзіць у вуліцу Цмэнтарную. Паралельна да іх, бліжэй Буга, пралягаюць вуліцы Брэсцкая і Замкавая; побач Замкавай вуліцы ёсць раннесярэднявечнае гарадзішча. Гэтыя дзве пары вуліц злучае згаданы Пляц Вызвалення.

Не ўдалося мне пераправіцца ў Няміраве на другі бераг Буга, але ўдалося падумаць, што варта было б у гэтай мясцовасці перакінуць кладку над Бугам, над гэтай адной з мясцовых „вечных" граніц, аднавіць хаця так тое адзінства, якое было паміж Гнойнам і Нівіцамі ў той час, калі пачынала пісацца мясцовая гісторыя. Цяпер Няміраў адмежаваны з усіх бакоў: з аднаго дзяржаўнай мяжой, з другога магутнай ракой, а з трэцяга зарастае лесам. Паміж паўднёвым і паўночным Падляшшам сёння толькі мост у Турне, які стогне і душыцца ад празмернага транспарту. А кладачка ў Няміраве была б вельмі зручная для ціхага турызму — пешага і веласіпеднага. І той турызм быў бы незалежны ні ад узроўню вады ў Бугу, ні ад настрою ці здароўя паромніка, адзінай асобы, якая мае там ліцэнзію на плавальныя транспартныя паслугі. У Няміраве ж цяпер пачынаецца з нічога турыстычны г.зв. „Купецкі шлях", які ў сваёй гістарычнай іпастасі верагодна выходзіў з багатага Чорнага мора, цалкам магчыма, што ўздоўж цэлага, багатага цяпер гісторыяй, Буга.